Беларускі 2010 каляндар

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 52 (2798) Год LIV | Беласток, 27 снежня 2009 г. | Цана 3,00 зл. (VAT 0%)

Марознае „Бязмежжа” пад матылямі

Міра ЛУКША

Трынаццаты Літаратурны семінар „Бязмежжа” пачаўся ў наймарозныя снежаньскія дні — з вечара 18-га (да 20.12.2009. г.). З-за мяжы на бязмежную сустрэчу найцяжэй было дабрацца з замерзлага Мінска, дзе ледзь удалося адагрэць аўтобус, везучы перацярэбленую прастудамі групу літаратараў, усё ж моцную духам і талентамі. Зноўку сабраліся беларускія творцы з абодвух бакоў беларуска-польскай мяжы ў Новым Ляўкове, на хутары Лазовае, у аграгаспадарцы „Бора-Здруй” Людмілы і Барыса Казлоўскіх, якая стала пастаяннай яркай кропкай беларускіх мерапрыемстваў. А мароз, як сказаў арганізатар, з’явіўся новым імпульсам „Бязмежжа” ды выпрабаваннем. Вельмі не хапала аднак трох аўтарак — ад пачатку бязмежнай Надзеі Артымовіч з Бельска-Падляшскага, Людмілы Рублеўскай з Мінска і Святланы Варонік з Брэста.

— Вельмі цешыць, што гэтая ідэя, што ўзнікла ў 1989 годзе, — адзначыў Яўген Вапа, старшыня Беларускага саюза (ён разам з рэдакцыяй „Нівы” ды Міністэрствам унутраных спраў і адміністрацыі з’яўляецца арганізатарам гэтага беларуска-беларускага мерапрыемства), — так плённа развіваецца. Хачу прыгадаць, чыя была задума гэтай ідэі: Яўгена Вапы, Міколы Ваўранюка і Алега Латышонка. Сядзелі мы на Алегавай дачы ў Супраслі і думалі пра тое, што нас цікавіць. Нас, тады маладых людзей, цікавіла ўсё што беларускае. Мы, беларусы, жылі за гэтай сцяной, без Беларусі. Мы ўсё прымалі як іконы тое, што было з Беларусі. Думалі пра музыку — узнікла „Басовішча”. Каб ідэя „Бязмежжа” развінулася, пачакалі мы яшчэ пяць-шэсць гадоў. Я шчаслівы, што ідэя „Бязмежжа”, якое яднае нас — не пустаслоўная.

Дзякуючы рэалізацыі праектаў „Бязмежжа”, узніклі выданні — аўтарскіх кніг, перакладаў, часопіса. „Бязмежжа” гуртавала і гуртуе аўтараў — пісьменнікаў, крытыкаў, выдаўцоў з беларускай прасторы, якая не абмяжоўваецца толькі да памежнага польска-беларускага абшару. Аж прачнуліся ад зімовага сну два матылі і луналі над удзельнікамі семінара. Паводле беларускага міфа, гэта душы тых, хто хацеў быць з намі. Мы прадчулі, што гэта Ніна Мацяш і Анатоль Сыс.

Першы вечар на „Бязмежжы” быў прысвечаны перш за ўсё юбілею пяцідзесяцігоддзя Міхася Андрасюка, родам з Войнаўкі, вядомага журналіста і празаіка. Вечарына была пра ягоную паэзію, якую лічыць гэты масціты празаік грахом маладосці (усе паэтычныя спробы ды іншыя памылкі маладосці, як іх назваў, спаліў ён у 2000 годзе!). Дзякуй Богу, след ад гэтай выдатнай творчасці не прапаў, застаўся на старонках „Нівы”. „Знайшоўся верш”! — такі зборнік „Бязмежжа” выдала на юбілей Андрасюку, падмацавала гэты нежартоўны выбар мемарыяльнай дошкай, якая будзе павешана на роднай хаце пісьменніка. Шок так пазітыўна паўплываў на празаіка, што на правакацыйна пустых старонках у канцы зборніка напісаў ён новыя вершы. Прарвалася мяжа! Таму вось гэта і „Бязмежжа”. І якія шматабяцальныя словы праліліся: *Я не паэт. Паэты словам у ціш і звон пераўтвараюць камень. А мой верш — што? Размова. Пра смерць, жыццё. І пра каханне.* Так што 19 снежня зранку пачаўся новы этап Міхася Андраюска — усё ж — паэта!

Барыс Пятровіч Сачанка, выдатны празаік, намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў, выдавец часопіса „Дзеяслоў”, у якім друкуецца цвет аўтараў розных пакаленняў пішучых пабеларуску, распавёў пра беларускіх пісьменнікаў і іх грамадска-выдавецкую актыўнасць. Пасля ўзнікнення другога, праўладнага, творчага саюза пісьменнікаў, у СБП засталося 513 сяброў (сярод іх таксама беластоцкія аўтары). Тры асобы ў „Дзеяслове” выдаюць часопіс, выходзячы раз у два месяцы, у цяжкіх умовах, калі кідаюцца калоды пад ногі з боку ўлады. Выходзіць таксама часопіс „Беларусь літаратурная” і выдавецкая серыя „Кнігарня пісьменніка”. Бібліятэка „Нівы” ўзбагацілася пасля сустрэчы ў новыя выданні з „Кнігарні пісьменніка” (м.інш. Віктара Казько, Васіля Быкава, Вольгі Іпатавай і маладзейшых выдатных аўтараў, таксама томам „Пакахай мяне, калі ласка” — зборнікам сучаснай жаночай беларускай прозы). Будуць у нас таксама выданні „Гарадзенскай бібліятэкі”. Пра выданні серыі „Гарадзенская бібліятэка” распавёў Павел Мажэйка. Гэтая серыя з’яўляецца адным з некалькіх элементаў праграмы супрацоўніцтва Вроцлава з грамадскасцю Гродна — інтэлектуаламі, акадэмічнымі асяродкамі, незалежнымі журналістамі, палітыкамі і прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый. Кнігі выдадзеныя ў Вроцлаве ці Кракаве вельмі прыгожа афармлены. Гэта м.інш. „Магдэбургская Гародня” Юрыя Гардзеева, „Рыцары і дойліды Гародні” Алеся Краўцэвіча. Пра выдавецкія рэалізацыі і планы рэдакцыі „Нівы” і Беларускага радыё Рацыя расказаў Яўген Вапа. Чакаюцца тут выданні з серыі „Роднае бязмежжа” — аўтараў з Беласточчыны, Гродзеншчыны, Берасцейшчыны.

З аўтарскімі чытаннямі выступілі Сяргей Сыс, Юры Несцярэнка, Юры Гумянюк і жанчыны беларускай літаратуры — Ганна Аўчыннікава з Гродна, Дар’я Ліс з Залесся каля Смаргоні, Валярына Кустава і Галіна Дубянецкая з Мінска ды Міраслава Лукша і Ганна Кандрацюк з Беласточчыны.

Удзельнікі „Бязмежжа” падпісалі зварот Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь Рыгору Васілевічу „з хадайніцтвам адносна рэабілітацыі славутай паэткі Ларысы Геніюш. Рэабілітацыя Ларысы Геніюш і прызнанне ёй беларускага грамадзянства стала б першым сімвалічным сплачваннем даўгоў беларускага грамадства перад гэтай мужнай, нязломнай жанчынай, сапраўдным патрыётам сваёй радзімы (...). Хопіць ужо варажнечы і дзяльбы на „правільных” і „няправільных” унутры беларускага народа. Прыйшоў час яднання, і ў гэтым дапамогуць такія аўтарытэтныя дзеячы беларускай гісторыі — як Ларыса Геніюш”.

Быць надалей разам ☞ 2

Яўген ВАПА

На нашай беларускай беластоцкай прасторы ў наступным годзе ўсім дастаткова будзе палітычнага тэатра ў выглядзе самаўрадавых выбараў. Ізноў за нашы галасы і грошы будуць змагацца прэтэндэнты ў войты ці бурмістры. Таму напэўна можам спадзявацца вялікай колькасці культурна-выбарчых фэстаў, на якіх будзем пляскаць у далоні народным абраннікам. Пры добрай музыцы і закусцы нікому не захочацца паставіць ім нявыгадных пытанняў — нельга ж псаваць свята!...

9 770546 196000

Наша цывілізацыя

Чарговы год праляцеў хутка. Людзі, за сваімі клопатамі і турботамі, толькі тады і заўважаюць бег часу, калі надыходзіць нейкая знакамітая дата — дзяржаўная, або рэлігійная. Або свая, інтымная, такая як уласны дзень нараджэння, калі па невядомай нікому прычыне чалавек весяліцца з таго, што стаў на год старэйшы. Ёсць і даты, якія адзначаюць усе. І ўсе вяселяцца ды радуюцца, і нават ведаюць чаму.

Да такіх датаў належыць і светлае свята Нараджэння Ісуса Хрыста, або як называлі гэта ў нас на вёсцы, ды называюць і зараз, свята Божага Нараджэння.

Нам, беларусам, пашанцавала. Мы гэтае свята святкуем два разы — па юліянскім, і па грыгарыянскім календары. І хоць кожны беларус належыць да нейкай адной рэлігійнай канфесіі, святочны настрой суседзяў, званы храмаў другой хрысціянскай канфесіі прымушаюць абодва святы лічыць сваімі нацыянальнымі. Рэлігійна кожны мае адно Божае Нараджэнне, нацыянальна — два.

Такая мы нацыя. Адсюль хіба і легенды пра наш менталітэт, пра нашу гасціннасць, пра нашу тэлерантнасць... Бо яшчэ за мільёны і мільярды гадоў да таго, як чалавек упершыню акрэсліў нейкую тэрыторыю на гэтай планеце і назваў сваёй, задоўга да таго, як на зямлі з'явілася першая мяжа, Той, чыё Нараджэнне мы святкуем два разы, прадвызначыў наш лёс і даў нам месца паміж усходняй і заходняй цывілізацыямі. І прадвызначыў нашу місію.

Стагоддзямі тыя цывілізацыі, зыходзячыся адна з другой, маглі нас раздушыць. Маглі, ды не змаглі. А спрабавалі, так і не задумаўшыся пра тое, што наша місія — з'яднаць іх, што мы і зрабілі на сваёй зямлі, дзе ў адным і тым мястэчку чуваць званы і царквы, і касцёла. Нам гэта ўдалося, хоць нас не толькі не разумелі суседзі, але і перашкаджалі гэта рабіць. Ды мы і самі часам не разумелі, якую вялікую справу мы робім, якую вялікую ідэю рэалізоўваем. Але мы так рабілі, бо гэта наш шлях, бо гэта наш менталітэт, бо мы пераканаліся, што так лепш. Лепш усім, бо мы такія. І акурат гэта характарызуе нас як асобны народ, як універсальную нацыю, са сваімі поглядамі на свет і са сваёй місіяй. Гэта паказвае нас як нацыю, якая змагла ў гэтым напружаным свеце стварыць сваю ўласную беларускую цывілізацыю.

Новы год мы таксама святкуем два разы, каб нікога не пакрыўдзіць — ні ўсходнюю, ні заходнюю канфесію. Робім гэта для некага. У выніку нам жа лепш атрымліваецца, бо кожны год маем на цэлы Новы год больш, чым іншыя. Маем свой, унікальны, не падобны да нікога погляд на свет, свой стыль паводзін, свой характар.

Ёлкі ў нас паставяць раней чым на Усходзе, а вынесуць з хатаў іх пазней, чым на Захадзе. І нашы дзеці ў два разы больш па часе чым іншыя будуць пытацца ў сваіх бацькоў, што тыя ёлкі значаць і чаму яны стаяць так доўга. І даведаюцца пра два календары, пра тое, што мы такія людзі, якія ёсць, і недзе глыбока-глыбока ў душы, проста інтуітыўна, адчуюць сваю місію. Зразумеюць, яшчэ не мазгамі, а душой і сэрцам, што гэта такое быць беларусам. Адчуюць, што гэта значыць жыць паміж дзвюма вялікімі ідэалогіямі, паміж Усходам і Захадам, і захавацца як асобны народ, місія якога рана або позна будзе здзейснена.

На каталіцкае Божае Нараджэнне праваслаўныя будуць віншаваць каталікоў, на праваслаўнае — каталікі праваслаўных. На Новы год, у дванаццаць гадзін ночы па беларускім часе, амаль дзесяць мільёнаў чалавек адначасова пажадаюць сабе і сваім блізкім прыкладна аднаго і таго ж: каб наступны год быў лепшы, чым папярэдні, каб усё дрэннае засталося ў старым годзе і больш не вярталася. А ў Новым годзе каб было толькі добрае і светлае.

Пакуль што гэта толькі надзеі і спадзяванні. Але трэба верыць у тое, што яны часткова або цалкам збудуцца, бо той народ, які змог з'яднаць усходні і заходні менталітэты, зрабіць свята з таго, з чаго іншыя варагуюць, расчыніць свае сэрцы для кожнай светлай падзеі, той народ, які змог стварыць сваю цывілізацыю, заслугоўвае таго, каб яму пашанцавала, каб яго пажаданні збыліся.

І каб у хуткім часе яму ўдалося цалкам рэалізаваць сваю місію, і пашырыць яе за межы сваёй зямлі. Бо так лепш. Лепш для ўсіх.

Віктар САЗОНАЎ

Быць надалей разам

Ізноў пры канцы снежня каляндарны цыкл нагадвае нам, што чарговы год павіс нам за плячыма . Але ці ўслед за гэтым прыбавілася нам жыццёвага розуму? Хіба не. Аднак калі б так было, то ўжо даўно б мы справіліся з нашымі чалавечымі памылкамі і грахамі . Толькі не з несмяротнасцю, бо яна проста застаецца звышчалавечай таямніцай. І на шчасце не можна яе яшчэ купіць. Чалавечыя ілюзіі наконт зямной дабрыні, асабліва шырока разліваюцца гукамі на ўсіх мовах свету напярэдадні новага года. За такую ветлівасць і ласкавасць, якая плыве з рэкламных афішаў і ролікаў, мы нашмат больш абавязаны чым каляднікам. Вядома чым — выкінутымі грашыма на святочную непатрэбшчыну. У напружаных святочных гонках шматразова пераступаем парогі крамаў, галерэяў, забываючы толькі абстукаць свае боты аб парог царквы ці касцёла. Прыемны рытуал канзумерызму выцясняе сферу аўтэнтычнай рэлігійнасці з нашага культуралагічнага круга. Менавіта таму разам з нашымі пастырамі так любуемся ў звыштэатралізаваных багаслужбах.

На нашай беларускай беластоцкай прасторы ў наступным годзе ўсім дастаткова будзе палітычнага тэатра ў выглядзе самаўрадавых выбараў. Ізноў за нашы галасы і грошы будуць змагацца прэтэндэнты ў войты ці бурмістры. Таму напэўна можам спадзявацца вялікай колькасці культурна-выбарчых фэстаў, на якіх будзем пляскаць у далоні народным абраннікам. Пры добрай музыцы і закусцы нікому не захочацца паставіць ім нявыгадных пытанняў — нельга ж псаваць свята! А пытанні самі ставяцца: як пакарысталіся еўрасаюзнай дапамогай паасобныя гміны, ці належную ўвагу адводзіцца беларускай асвеце і культуры ў выглядзе, напрыклад, закупкі і падпіскі на беларускія выданні, калі гмінныя самаўрады ўвядуць беларускую мову як дапаможную і выступяць за ўвядзенне падвойных дарожных указальнікаў. Ужо ў 2011 г. у Польшчы праведзены будзе чарговы перапіс насельніцтва. У яго ходзе адкажам таксама на пытанне пра нашу нацыянальнасць. Колькі будзе нас — беларусаў — шмат у чым менавіта залежыць ад таго, як да беларускага пытання будуць ставіцца выбраныя намі ўлады. Напэўна патрэбная ўсім інфармацыйная акцыя з заклікам аўтарытэтных людзей з нашага асяроддзя. Думаю, што галавы ў пясок не павінны хаваць і царкоўныя структуры, бо павінны быць са сваім народам.

Важнасць вышэйзгаданых спраў будзе адлюстроўвацца ў нашай рэдакцыйнай працы. Менавіта як тыднёвік беларусаў у Польшчы хочам апісваць і добрае, і набалелае, вяртаць памяць пра забытыя імёны нашай Бацькаўшчыны. Менавіта таму наш каляндар на 2010 г. прысвячаем Ларысе Геніюш, выдатнай беларускай паэтэсе, ахвяры сталінскіх рэпрэсій, якую за любоў да беларускага дагэтуль не рэабілітавалі. Беластоцкая зямля для яе не чужая. Яе род Міклашэвічаў вядзецца з-пад Крынак. У Крынках нарадзіўся і жыў ейны муж Янка. У Беластоку жыў яе сын Юрка Геніюш — таксама выдатны беларускі пісьменнік і лекар, сябра літаратурнага аб'яднання „Белавежа". У Беластоку жывуць унукі паэткі. Калі чытаем успаміны і дзённікі Ларысы Геніюш, дык бачым, як жывучы ў Зэльве, што на Гарадзеншчыне, не забывала пра Беласточчыну, чытала „Ніву" і ўсе беластоцкія беларускія выданні. Вось менавіта ў каляндарным выданні бачым яе пісьмы з цудоўнымі малюнкамі для сваіх унукаў, дасыланыя ў Беласток. Ад імя рэдакцыі дзякуем таксама сям'і Геніюшаў за магчымасць публікацыі ўнікальных здымкаў.

Ад наступнага 2010 г. павышаем цану аднаго экземпляра „Нівы" на 50 грошаў. Ужо некалькі гадоў цана газеты не ўзрастала. Аднак кошты яе выдавання сістэматычна павышаюцца. Не будзе, на жаль, і магчымасці выдаваць чатырох каляровых старонак. Фінансавыя кошты такога друку нам не пад сілу. Аднак як рэдакцыя будзем рабіць усе намаганні, каб змешчаныя матэрыялы ўсебакова асвятлялі жыццё нашай меншасці. Пастараемся даехаць туды, дзе нас запрашаюць, і трапіць туды, дзе нешта важнае для нас адбываецца.

Усім нашым чытачам дзякуем за тое, што Вы з намі, за 53 гады адданасці беларускаму слову. І дзеля гэтага варта нам усім быць надалей разам!

Яўген ВАПА

Вачыма еўрапейца

Без дыягназу

Я з увагай сачыў за ходам аднаго з пасяджэнняў сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей. У яго час упаўнаважаная ўрада па справах аднолькавага трактавання Альжбета Радзішэўская гаварыла аб рэалізацыі Краёвай праграмы супрацьдзеяння расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі неталерантнасці ў 2004-2009 гадах. Гэтая праграма была прынята Радай Міністраў як вынік абавязацельстваў Польшчы ў адпаведнасці з ААНаўскімі дакументамі па гэтай праблематыцы. У час пасяджэння камісіі спадарыня ўпаўнаважаная прыгадала:

— Гэта пяцігадовая праграма. Яе мэтай было змаганне з ксенафобіяй і расізмам, між іншым, антысемітызмам, ды выхоўванне польскага грамадства ў шырока разуметай культуры талерантнасці ў адносінах да людзей іншых рас і культур.

Ужо на самым пачатку для рэалізацыі праграмы меў быць створаны спецыяльны наглядальны камітэт, у склад якога мелі ўваходзіць прадстаўнікі міністэрстваў і няўрадавых арганізацый:

— Пасля кожнага года яго рэалізацыі мела быць падрыхтавана чарговая справаздача, падагульняючая дзеянні выкананыя ў рамках гэтай праграмы. Справаздачы павінны быць прадстаўлены на пасяджэнні Рады Міністраў і павінны быць ёю прыняты.

Значыць, меў быць пастаўлены на працягу гэтых пяці гадоў дыягназ праблемы ксенафобіі, дыскрымінацыі і неталерантнасці ў Польшчы, а затым прыняты сістэмныя меры па іх перамаганні і супрацьдзеянні ім. Наглядальная група, аднак, у першыя гады не ўзнікла, а затым і справаздачы, якіх не было (з усімі практычнымі іх вынікамі) не маглі быць прыняты ўрадам. Толькі год таму, калі зноў быў назначаны ўпаўнаважаны ўрада па справах роўнага статусу, такая група ўзнікла і дагэтуль правяла тры сустрэчы.

— Праграма была, але крыху быццам яе не было. Таму маюцца нейкія клопаты, калі гаворка пра саставленне рапарта, — прызналася ў Сейме ўпаўнаважаная Радзішэўская.

Дадала прытым, што за мінаючы год удалося пачаць пэўныя дзеянні, датычныя м.ін. учынення правасуддзя і асветы больш пільнымі ў гэтай тэматыцы ды супрацьдзеяння расісцкім паводзінам у спорце. Ад будучага года да рэалізацыі Праграмы маюць быць прыцягнуты лакальныя самаўрады:

— Маю надзею, што новая стратэгія будзе прынята на чарговыя гады пасля 2010 года.

Добра сталася, што практычная рэалізацыя Краёвай праграмы супрацьдзеяння дыскрымінацыі пачала набіраць тэмп. Аднак, на маю думку, найважнейшае тое, аб чым успомніла сама пані ўпаўнаважаная:

— Ёсць вельмі многа работы. Змена спосабу мыслення, адмена розных стэрэатыпаў, змена ментальнасці — гэта справы, над якімі трэба вельмі шмат працаваць.

Прытым дадала:

— Праблема тым большая, што Краёвая праграма супрацьдзеяння расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі неталерантнасці не спрацавала. Як дзяржава мы не дарабіліся сістэмы маніторынгу расісцкіх і ксенафобных з'яў. Усё ж такі маю надзею, што адбудзецца гэта ў рамках праекта далейшага дзеяння.

Пры нагодзе. Нядаўна ў „Вачах" пісаў я пра даступнасць у чытальнай зале беластоцкай „Падляшскай кнігі" расісцкай бібліі — „Mein Kampf" Адольфа Гітлера. Успомніў я тады, што справай зацікавілася дэпутатка Малгажата Кідава-Блонская. Пасля я даведаўся, што беластоцкі радны Рафал Рудніцкі падаў у гэтай справе дэпутацкі запыт прэзідэнту Беластока і падляшскаму маршалку, якому „Кнігі" падлягае.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Šeima па-літоўску значыць сям'я

Ілона КАРПЮК


Фота Адама Паўлоўскага

Пётр слаў Тамарцы лісты кожнага дня. Тамарка жыла ў Рэпісках з бацькамі і бабуляй Аняй. Аднойчы бабуля не вытрымала і прачытала. Тамарка здагадалася, бо ліст быў надарваны.

— Што вы зрабілі? — спытала ўнучка.

— Но то пшэпрашам бардзо, — адказала бабуля, якая польскай мовай наогул не карысталася.

На старасць бабуля Аня палюбіла каву. Брудныя кубкі з кававай гушчай увесь час стаялі на буфеце. Калі бабулі сталі звяртаць увагу, то пачала кубак ставіць у буфет. Аднойчы дачка сказала, што нельга хаваць брудныя кубкі, асабліва таму, што Пётр прыязджае і можа гэта пабачыць. Бабуля адказала па-свойму:

— Ты, Люба, скажы яму, каб ён туды не заглядаў!

Бабулі Анелі з Ашкіняў (Ožkiniai) ужо 96 гадоў. Як самая старэйшая ў сям'і карыстаецца пашанай і безумоўнай любоўю ўсіх пакаленняў.

— Найбольш нецярпліва наша бабуля чакае вынікаў „Таталётка"! — распавядае маці Пятра. — „Купіў купон?" — пытаецца кожны раз майго мужа. Нервуецца, бо кажа, што за гэтыя грошы выкупяць бацькоўскую зямлю, якую калісьці аддалі дзяржаве за пенсію.

— Літоўцы безумоўна мацней прывязаныя да зямлі, чым нашы людзі, — кажа Валодзя, беларус са Спічок, бацька Пятра.

Пётр і Тамарка

Бабуля Аня была добрым духам Тамаркі. Анеля — гэта літоўская душа Пятра. У Пеціным жыцці важную ролю адыграла яшчэ бабуля Дуня. У яе, у Спічках, вучыўся беларускай гаворкі.

Тамара і Пётр пазнаёміліся ў студэнцкія часы.

— Пазнаёміліся мы ў выпарэннях алкаголю, але можа пра гэта лепш не пісаць, — какетліва расказвае Тамара.

— Папраўляліся па вяселлі сябра, набралі вясельнай гарэлкі і далей святкавалі ў іншага супольнага калегі. Пасля ўжо Пётр наведаў Тамарку з віном (пайшлі ў нейкі заклад, як відаць, прайграў Пётр). Аднак упершыню бачыліся, калі супольна паехалі ў Тэзэ, у Францыю, у рамках экскурсіі наладжанай БАСам.

— Бачыш, які Пётрэк быў прыгожы, — паказвае здымкі Тамарка, — цяжка было не закахацца.

На пачатку гаварылі з сабой на польскай мове, у бацькоўскіх хатах было па-іншаму. Тамара з бацькамі размаўляла толькі па-беларуску. А Пётр? У хаце яго бацькі гаварылі на польскай мове, але дзяды выводзіліся з розных культурных кругоў.

— Неяк я не думала, што ўваходжу ў літоўска-каталіцкую сям'ю, — задумваецца Тамара. — Важнае, што добра мяне прымалі. Нават на бабулю Анелю гавару „мамуся", але, зразумела, па-літоўску. Бабуля часам прыпамінае мне, што перад шлюбам абяцала я навучыцца літоўскай мове, але ж чаго не абяцаюць людзі перад шлюбам... — смяецца Тамара.

Для Пятра нацыянальныя кантрасты былі штодзённасцю. Яго бацька, беларус са Спічок, маці — літоўка з Ашкіняў. З бабуляй Дуняй размаўляў па-свойму. У Ашкінях спачатку па-польску, бо польскую мову ведалі таксама яго дваюрадныя равеснікі, але аднойчы ўдала спалохаў іх дзед: „Як не будзеце гаварыць па-літоўску, пакусаюць вас пчолы!" Пётр дзіцём пазнаваў абедзве культуры. Засвойванне адбывалася на ўзроўні мовы, але таксама веравызнанняў. Спадар Валодзя, бацька Пятра, кажа:

— Святкуем, калі іншыя святкуюць, наша тоеснасць таксама абапіраецца на праваслаўныя ці каталіцкія традыцыі, але Бога ўсё ж такі шукаем.

Безумоўна, можна назваць гэта крэатыўным падыходам, сёння можа нават і не так рэдкім. Адкрытасць, але ў пэўных межах, характэрная была таксама нацыянальнаму выхаванню дзяцей.

— Я, зразумела, літоўка, — кажа маці Пятра.

— Я таксама запісалася літоўкай, — кажа малодшая сястра Пятра, — хаця зараз ведаю, што і беларускасці ў мяне шмат.

Пётр выбраў беларускую тоеснасць.

— Прашу не здзіўляцца, — завяршае ўрачыста бацька сям'і, — я таксама беларус, але ўжо мая сястра пішацца ўкраінкай.

— Дзеці ў вашай сям'і пайшлі па жаночай або мужчынскай лініі, — смяюся.

— Мы ім нічога не загадвалі, не падказвалі таксама, — сур'ёзна адзначае бацька. — Паказалі толькі свае светы. Можа не так зусім розныя, бо, напрыклад, шмат слоў супольных беларускай і літоўскай мовам. Ну і супольная гісторыя, вялікая гістарычная Літва ці хаця б вялікая сімпатыя для князя Вітаўта.

Беларуска-літоўска-праваслаўнае

Вырашальным момантам для Тамары і Пятра быў шлюб.

— Быў момант, калі маёй бабулі здавалася, што вяселля не будзе, — нясмела, але з настальгіяй расказвае Тамара. — Калісь часта жаніліся, калі дзеці былі ўжо ў дарозе. Бабуля Аня думала, што ў нас таксама. Аднаго дня перабірала яна мае рэчы для мыцця і жахліва сказала: „Ёсць на бялізне — шлюбу не будзе?"

Шлюб быў, але самае вялікае значэнне меў ён для Пятра.

— З дзяцінства я помніў святкаванне ў царкве, — распавядае. — З бабуляй Дуняй на Ілью ездзілі возам у Падбелле. Заходзілі ў царкву, пастаялі, пасля выходзілі, пасядзім з яе сяброўкамі на траве, пагутарым, зноў увойдзем у царкву. Усё без мусу, з лёгкасцю, натуральна. Зусім не тое, што ў Пунску. Там вялікія шэсці з харугвамі, нацыянальныя літоўскія касцюмы, вялікія вянкі, рыхтаваныя кожнай вёскай. Можа для дарослых было гэта цікава, бо для мяне, дзіцяці, было надта напышлівае.

Пётр вырашыў, што хоча жаніцца ў царкве. Хаця ахрышчаны ў касцёле, не хацеў быць як „у гасцях". Выканаў усе ўмовы прадугледжаныя сакраментамі і прыняў камунію. Стаў праваслаўным, але, як сам падсумаваў: „Беларусы да сваёй беларускасці даходзяць найчасцей праз праваслаўе, у мяне было наадварот".

— Ён мне патлумачыў нашу веру, — кажа пра Пятра яго жонка Тамара. — Мая мама, яе сёстры былі вельмі веруючымі, але мая ўлюбёная бабуля Аня ўжо не так. Зразумела, што я ў царкву ў маладосці хадзіла, але без вялікага зразумення.

— Тамара, нібыта сямейны летапісец, добрасумленна збірае расказы з абодвух сем'яў. Гісторыі параўноўвае часта да падзей з прачытаных кніжак. Часам здаецца, што іхнія сямейныя лёсы гэта доўгая лірычная казка з дозай гумару.

— Гумарыстычна ды іранічна ў сям'і Пётрка гавораць пра палякаў, — звяртаецца да Пятра, шукаючы пацвярджэння, Тамара.

Адкрыта гаворыць пра тое і спадарыня Рута.

— Літоўцы, калі ўваходзілі ў польскія сем'і, вельмі хутка апалячваліся, — расказвае. Гэта выклікала супраціў. — Мая мама была супраць майго шлюбу. Бацька быў больш адукаваны і стрыманы. Дапамог пераканаць маму. Напэўна лягчэй было таму, што Валодзя быў беларусам, з праваслаўнай сям'і, не палякам. Мой бацька працаваў калісьці ў беларускай школе на беларуска-літоўскім памежжы.

Іншае вымярэнне мелі супольныя візіты. Бацька Тамары, Алёша, аднойчы пабываў на самым вялікім літоўскім свяце, на „Зелянцу" ў жніўні. Пакуль да літоўцаў папалі жыхары Тамарчыных Рэпіск, раней ездзілі туды спічкоўцы.

— Бабуля Дунька здзіўлялася, што там, на поўначы, столькі ўзгоркаў і вады, — успамінаюць бацькі Пятра. — „Дзеці патопяцца!" — пераймалася.

Бабулю Анелю таксама павезлі на Падляшша.

— Тут так плоска... А дзе возера? — пыталася.

— Няма. Толькі рэчкі

— Толькі рэчкі? — не магла зразумець.

Зразуменне для краявіду на шчасце не так важнае як узаемаразуменне. Літоўцы і беларусы, якіх спалучылі Тамара і Пётр, сябе якраз вельмі паважаюць.

— Па шчырасці кажучы, з ліку славян літоўцы найбольш паважаюць украінцаў, — прызнае Рута. — За іх бадзёрасць, мужнасць. Але з беларусамі дагаворваемся.

— Вельмі люблю, калі прыязджаюць бацькі Пятра, — кажа спадар Алёша, бацька Тамары. — Заўсёды сядзем, добра пад'ямо, вып'ем з Рутай, пажартуем. Шкада, што так рэдка, толькі на найбольшыя святы.

За літоўскі стол любіць засесці таксама Тамара, бо ў асноўным ён вялікі, а вакол цікавая, вялікая сям'я, якую прыцягае бабуля Анеля.

— Нават ужо арыентуюся, пра што па-літоўску гавораць за сталом, — ганарыцца Тамарка.

— Я не навучыўся літоўскай мове, — прызнаецца Валодзя. — Можа, каб было больш славянскіх элементаў...

Новае пакаленне

Дзеці Тамары і Пятра размаўляюць так як іх бацькі — па-беларуску.

— У школе нараджэння я пачула як свабодна па-свойму размаўляе Бася Пякарская (цяпер старшыня аб'яднання АББА), — расказвае Тамара. — Тады я зразумела, што і мы так можам. Асяроддзе вельмі памагае, а вакол нас было шмат такіх сяброў, а і дзеці мелі равеснікаў, з якімі таксама маглі гаварыць па-свойму.

Тамара ўспамінае, што быў час, калі іх сын бунтаваўся супраць беларускай мовы.

— 4-5 гадоў яму было, але ведаю, што не толькі ён бунтаваўся. З малодшымі дзяцьмі было ўжо лягчэй. У нас Нюта ўжо не стварала праблемаў.

Старэйшы сын, Ігар, ужо ў гімназіі. Нядаўна прымаў удзел у беларуска-літоўскім праекце „Вялікае Княства Літоўскае — наша супольная спадчына". Аднойчы моладзь з Пунска была ў яго сям'і ў гасцях. Бацька, Пётр, павёў экскурсію па Супраслі... на літоўскай мове.

— Твой бацька гаворыць па-літоўску, чаму ты не? — пыталіся Ігара літоўскія сябры.

Сорамна яму не было, бо ягоныя бацькі — беларусы, але штосьці падштурхнула.

— Сказаў калісьці, што ён у палове літовец, але ніводзін рахунак гэтага не пацвярджае, — смяецца Пётр.

Фота Адама Паўлоўскага

Дзе верныя чытачы „Нівы”?

У Нараўчанскай гміне ёсць здаўна пастаянныя чытачы нашага беларускага тыднёвіка „Ніва”. 16 снежня г.г. патэлефанаваў я Уладзіміру Клімюку з вёскі Плянта. Ён наш былы карэспандэнт, цяпер верны чытач. Уладзімір Клімюк робіць квартальную падпіску на „Ніву”. Прыносіць яе яму лістаноша.

— Я чытаю ўсе допісы Янкі Целушэцкага і Міколы Варанецкага, — кажа спадар Клімюк. — Аднойчы надумаўся напісаць у „Ніву” пра непаладкі на беластоцкім вакзале ПКС. Але прыйшла „Ніва”, а ў ёй ужо пра гэта піша Целушэцкі! Ён з запалам напісаў! І далей ён усё бачыць у Беластоку. Па ўсім відаць, ён там часта бывае і нічога не праваронiць, калі што там не так, як павінна быць. Мікалай Варанецкі напісаў пра кніжку Барыса Нікіцюка пра Гайнаўшчыну. Паеду ў Гайнаўку, зайду ў кнігарню і куплю яе ў сваю дамашнюю бібліятэчку.

Жыхар Семяноўкі Славамір Кулеша купляе „Ніву” ў мясцовай ГСаўскай краме ў кожны чацвер. Туды яе рэгулярна прывозяць. Ён цікавіцца перш-наперш тым, што журналісты і карэспандэнты пішуць пра людзей і іх справы ў Нараўчанскай гміне. Спадар С. Кулеша — шматгадовы радны, грамадскі актывіст, верны сябра „Нівы”.

Мікалай Варанецкі з Альхоўкі піша зацемкі ў „Ніву” і дакладна яе чытае. Ён раней настаўнічаў у школе ў Старым Ляўкове, затым у Нараўцы. Зараз ён на заслужанай пенсіі. „Ніву” ён купляе ў Нараўцы або ў Гайнаўцы.

Паехаў я ў Плянту. Сустрэў прыгожую жанчыну і спытаўся ў яе, ці чытае яна „Ніву”.

— Цяпер я купляю яе час ад часу, — адказала мне кабета. — Напэўна куплю той нумар з „Беларускім календаром”. Раблю гэта штогод. Ведаю тады, калі якія святы. Купляла „Ніву” ў час сваёй маладосці. Цікавілі мяне песні, якія друкаваліся на апошняй старонцы. Цяпер ахвотна купіла б беларускі часопіс, калі б былі ў ім узоры для ручной вышыўкі. Цяпер у доўгія зімовыя вечары я займаюся гафтаваннем.

— А калі б было „Сэрцайка”, купілі б „Ніву”?

— Ужо не мне чытаць пра чужое каханне! Свайго хацелася б. О, так! — пачуў я ў адказ. **(яц)**

PS. У чацвер, 17 снежня г.г., я быў у краме ГСу ў Старым Ляўкове. У гэты дзень павінен быць свежы нумар „Нівы”, але не было. Ці распаўсюднікі падаліся ў зімовы сон?

„Малалетак”

10 снежня паліцэйскія Павятовай камендатуры ў Гайнаўцы правялі акцыю „Малалетак”. Супольна з псіхолагамі і педагогамі тамашніх пачатковых школ і гімназій правяралі непаўналетніх, якія ўступілі ў канфлікт з законам, як і небяспечныя ўчасткі. Праверкай былі абняты таксама паталагічныя сем’і, у якіх малалетнім пагражае дэмаралізацыя. Пільнай увагі функцыянераў не пазбеглі месцы зборышчаў агрэсіўнай моладзі, якая гуртуецца ў вячэрні час, а таксама прытоны, дзе спажываюць наркотыкі або прымушаюць малалетак да прастытуцыі і жабрацтва. У час кантролю было праверaных 80 малалетак у раёне гастранамічных аб’ектаў і крамаў, дзе гэтыя могуць купляць алкаголь. Праведзена 120 прафілактычных размоў з бацькамі, апекунамі і самімі непаўналетнімі. У час акцыі выяўлена сем асоб, якія здзейснілі злачынства, а дзве асобы аштрафавалі. **(ус)**

Інвестыцыйная карціна Арлянскай гміны

Размова з войтам Арлянскай гміны Пятром СЭЛЬВЕСЮКОМ.

Фота Міхала МІНЦЭВІЧА

— У Орлі, як і па цэлай гміне, відаць змены...

— Мінаючы год быў рэкордным у інвестыцыйным плане — на інвестыцыі выдаткавалі мы больш за тры мільёны злотаў. Калі б узяць пад увагу цэлы гмінны бюджэт, які ў нас пад восем мільёнаў злотаў, то ў нашым ваяводстве не будзе такога самакіравання, а мяркую, што і ў маштабе краіны такіх мала, якое амаль сорак адсоткаў прызначыла на інвестыцыі. Гэта відаць і ў Орлі, і ва ўсёй гміне, напрыклад, 30 лістапада была пастаўлена прыгожая новая паветка на аўтобусным прыпынку. Гэта рэч невялікая і недарагая, але добра прэзентуецца і цешыць. Мо яе хто і знішчыць, але ж не будзем кіравацца такімі засцярогамі, бо панішчыць можна ўсё, але робіцца дзеля таго, каб было.

Звяртаю таксама ўвагу на дэталі, дробязі. І другой навінкай, якая мяне радуе, з’яўляецца ілюмінацыя, святочныя светлавыя заслоны, якія аздобяць вулічныя дрэвы перад будынкам гміннай управы. Яны ўвядуць у большы святочны настрой амаль цэлы цэнтр Орлі.

— А якія інвестыцыі па-за Орляй?

— Мяркую, што найбольшай было заасфальтаванне павятовай дарогі Орля — Спічкі ды вясковай вуліцы. Усяго было чатыры кіламетры, якія ахапілі і два адрэзкі гміннай дарогі. Работы на павятовай дарозе каштавалі больш за адзін мільён і трыста тысяч злотаў, а гмінная дарога патрабавала за сто тысяч злотаў. Поспех тым большы, бо гэтыя сродкі былі прыдбаны звонку: 50% г.зв. схетыновак, а павет і гміна даклалі да іх па 25%. Значыць, за нашы трыста тысяч пабудавалі нам дарогу вартасцю ў мільён і трыста тысяч. На працягу трох гадоў паклалі мы новае палатно на пятнаццаці кіламетрах павятовых і гмінных дарог.

— А дзе ў гміне няма яшчэ добрай дарогі?

— Дарогі можна пракладаць бясконца, аднак нам асабліва пільна давесці да прыстойнасці вялікі адрэзак павятовай дарогі Дыдулі — Круглае. Па той дарозе ездзіць гмінны аўтобус і людзі ў царкву.

— Але і ў самой Орлі ёсць некалькі вуліц без асфальтавага насцілу...

— Таксама. У Орлі няма клопату пакласці асфальт, але перш за гэта трэба там пракласці каналізацыю. Мы ўжо падалі заяўку на дафінансаванне каналізацыі; заяўка атрымала станоўчую ацэнку. Гэта таксама важная справа, бо планаваная на наступны год пракладка каналізацыі будзе каштаваць тры мільёны і шэсцьсот тысяч злотаў і палову з гэтага нам дафінансуюць.

Чарговым нашым дасягненнем быў вялікі мадэрнізацыйны рамонт вясковай святліцы ў Крывятычах, на які таксама атрымалі дафінансаванне вартасцю ў сто тысяч злотаў.

— Варта падкрэсліць, што цяпер рамонты іншыя чым у мінулым...

— У часе рамонту мяняем столь і падлогі, устаўляем новыя вокны і дзверы. Тут нечага займацца дробязямі, а трэба зрабіць адразу ўсё.

Пытаю яшчэ прысутнага солтыса Крывятыч, а заадно і старшыню Гміннай рады Аляксандра Кліна, ці зараз у вясковым грамадстве памяняліся адносіны да святліцы (бо ж амаль па ўсіх вёсках „хуліганы” найчасцей выбівалі шыбы ў вокнах).

— Калі нешта ёсць новае і функцыянальнае, тады і моладзь інакш да гэтага адносіцца. І думаю, што так будзе і ў нас. Таксама і старэйшыя людзі сталі цяпер заходзіць у святліцу, пагуляць у карты. Будзе вясковы сход і выбярэм асобу, якая возьме адказнасць за святліцу, будзе пра яе дбаць. Зараз у нашай святліцы цэнтральнае электраабагравaнне, вялікая кухня, лазенькі, прыбіральня ўсярэдзіне, каналізацыя — як у нармальным жылым будынку. Людзі мусяць дбаць пра гэта, бо інакш давядзецца святліцу закрыць.

Сёлета былі праведзены рамонты святліц у Кашалях, Дыдулях, Кошках, а зараз пачынаем рамонт інтэр’ера ў Шарнях. Узведзена ў суровым стане святліца ў Вульцы-Выганоўскай.

Апрача гэтага быў пакладзены новы асфальт на дарогу з Орлі ў Міклашы. Асфальт пакладзены і на двух адрэзках арлянскіх вуліц: гэта вуліца Вызвалення і далейшы, найбольш знішчаны, звышкіламетровы сегмент дарогі з Крывятычы ды вуліца Бельская ад амаль моста да цэнтра — да скрыжавання з вуліцай Міцкевіча; гэта каштавала амаль паўмільёна злотаў. Гэта павятовыя дарогі, якія арлянскае самакіраванне дафінансавала ў межах 50% коштаў выканання (а папраўдзе ў размеры 30-40%, а рэшту склалі сродкі прыдбаныя звонку).

— А што ў планах на наступаючы год?

— Дайшло да нас ужо афіцыйнае паведамленне, што атрымаем пяцідзесяціпрацэнтнае дафінансаванне, г.зв. схетыноўкі, на рамонт вуліцы Сянкевіча і частку вуліцы Чырвонай Арміі ў Орлі. Кошт гэтага грунтоўнага рамонту (змена бардзюраў, новы асфальтавы насціл, новыя з’езды на панадворкі) складзе амаль дзевяцьсот тысяч злотаў. Апрача гэтага хочам абнавіць адпачынковы парк у цэнтры Орлі, бо гэта ж наша візітка. Трэба там пакласці новыя тратуары, знесці старую агароджу і стары жываплот, зрабіць пасярэдзіне прыстойную клумбу ды паставіць тыпова паркавыя ліхтары; дакументацыя на гэта ўжо выканана.

Таксама трэба пракласці каналізацыю; яе звонку не відаць, але без яе не абыцца большай мясцовасці.

Ёсць таксама намер апрацаваць тэхнічную дакументацыю новага Дома культуры ў Орлі. І ў гэтай справе таксама нельга абмяжоўвацца паўмерамі, тут павінен з’явіцца прыстойны гмінны цэнтр культуры — вялікі будынак, дзе будзе база, залы для заняткаў і сустрэч. Ну, і павінен ён быць таксама візіткай мясцовасці; мяркую, што стане ён у цэнтры, побач банка.

У цэнтры Орлі павінен быць парадак, бо як жа мясцовасць будзе ўспрымацца вонкавымі людзьмі, якія, для прыкладу, захочуць наладзіць тут нейкі бізнес, а пабачаць хаос...

— Гаворыцца, што шведская мэблевая фірма Ікея хоча пабудаваць у нашай гміне вялікую фабрыку. Што пра гэта можна сказаць сёння?

— Грунты — больш за сто гектараў — ужо куплены, а ў Бельску-Падляшскім фірма адкрыла сваё часовае бюро, якое будзе там да часу пабудовы адпаведнага аб’екта на інвестыцыйнай тэрыторыі. Завяршаюцца планістычныя працы, працэдуры ўхвалення планаў прасторавага добраўпарадкавання і ўсё паказвае на тое, што згодна з планам зямныя работы пачнуцца на зломе красавіка і мая 2010 года. Маюць тут паўстаць цэхі, у якіх будзе вытворчасць стружкавых панэляў і мэблі. Мае тут атрымаць працу каля дзвюх тысяч чалавек. Працаўладкавання павінны спадзявацца выпускнікі Дрэваапрацоўчага тэхнікума ў Гайнаўцы. Перад нашым рэгіёнам узнікае вялікі шанс. І то не толькі таму, што нашы жыхары атрымаюць тут працу. Так вялікая фабрыка будзе таксама патрабаваць пастаўшчыкоў, выканаўцаў паслуг і кааперантаў, а гэта стварае чарговыя стымулы развіцця. Захады самаўрадаўцаў па прыцягненні да нас такога інвестара даюць плён.

— Спытаю яшчэ пра ветравую фірму, бо гэта таксама абазначае новую інвестыцыю.

— Усё рухаецца наперад. Ужо пастаўлена вышка каля Спічкоў. Працягваюцца планістычныя і дакументацыйныя працы. У нашай краіне няма клопату з пабудовай, толькі трэба менавіта нарыхтаваць дакументацыю, узгадніць дазволы. План прасторавага добраўпарадкавання таксама ўжо на завяршэнні.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Міхал МІНЦЭВІЧ

Расслаўляюць беларушчыну

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Калі паявілася магчымасць арганізаваць агратурыстычную дзейнасць, адны глядзелі на яе з падазронасцю, апасаючыся кантралёраў і малога зацікаўлення прыезджых такога роду турызмам, другія ў новай прапанове ўбачылі курыцу, якая нясе залатыя яйкі. Зараз вядома, што ў агульным адны і другія разышліся з праўдай. Агратурыстычная дзейнасць у прынцыпе дае дадатковы заробак, але велічыня яго залежыць перад усім ад мясцовых турыстычных козыраў, месца распалажэння кватэр, маючы на ўвазе блізкасць да лесу, вады ці важнейшых дарог і якасці абслугі прыезджых. Толькі ў самой Белавежы, якую наведвае па 100-200 тысяч турыстаў у год, з агратурызму можна сям'і ўтрымацца. Апошнім часам штораз больш турыстаў стала наведваць агракватэры ў Нараўчанскай, Гайнаўскай, Дубіцкай і Кляшчэлеўскай гмінах. Нашы гаспадыні і гаспадары дабіваюцца даходаў з агратурызму, дзякуючы сваёй зычлівасці, мілай абслузе і цяжкай працы, якую трэба ўкласці, каб прыцягнуць айчынных і замежных турыстаў у свае кватэры. Уладальнікі агратурыстычных кватэр перакананы, што побач Белавежскай пушчы нашы беларускія традыцыі, культура і ўся спадчына з'яўляецца тым козырам, які прыцягвае турыстаў у прыпушчанскі рэгіён. Госці цікавяцца даўнім вясковым жыццём, беларускім фальклорам і нават нашай роднай мовай, просячы гаспадароў гаварыць па-свойму.

— Каб быў поспех у агратурызме, трэба любіць чужога чалавека і быць адкрытым на кантакты з іншымі людзьмі. Уласнік кватэры мусіць прысесці каля свайго госця, пагаварыць з ім. Бывае, што трэба кінуць работу і паехаць з турыстамі на экскурсію, — кажа Лена Харкевіч з Плянты, якая займаецца агратурыстычнай дзейнасцю і актыўна дзейнічае ў Белавежскім агратурыстычным аб'яднанні „Зубр". Згуртаваліся ў ім уласнікі агратурыстычных кватэр, каб супольна змагацца за прыезд турыстаў у Гайнаўскі павет і абменьвацца вопытам.

Каб турысты ахвотна вярталіся ў агракватэры

Агратурыстычныя кватэры дзейнічаюць у многіх нашых гмінах, але самая вялікая іх колькасць вырасла ў Белавежскай пушчы і на яе акраінах.

Наведаўшы Белавежскую пушчу, Лясны запаведнік, Зубрыны запаведнік, Прыродазнаўчы музей і многа іншых цікавых пушчанскіх месцаў, турысты шукаюць таксама атракцыёнаў па-за пушчай.

— Трэба ўмела паказваць турыстам нашы традыцыі, культуру, архітэктуру і прыроду. Кожная кватэра павінна быць іншай і прыцягваць турыстаў сваімі адметнасцямі, — мяркуе Лена Харкевіч з Плянты. — Многім турыстам падабаецца ўнутранае абсталяванне дамоў на даўні лад.

Спадарыня Лена Харкевіч побач сваёй агратурыстычнай кватэры ў гаспадарчым будынку паставіла ткацкі варштат, збірае даўнюю мэблю, старыя прылады працы і ткацкія вырабы. Айчынныя і замежныя турысты асаблівую ўвагу звяртаюць на даўняе рукадзелле, захапляюцца драўлянымі хаткамі з размаляванымі аканіцамі, навугольнікамі і даўнімі платамі.

Лена Харкевіч арганізавала ў Плянце ткацкі варштат

З-за „Лясной галерэі" і музейчыка ў клуні расславілася агратурыстычная кватэра Барыса Казлоўскага, распалажаная побач Ляўкова

Міхал Фільяновіч са Скарышэва сабраў мноства экспанатаў

— Маімі дзвюма хатамі, збудаванымі ў канцы XIX і на пачатку XX стагоддзяў, цікавяцца многія турысты. Затрымліваюцца і фатаграфуюць іх. Просяць таксама паказаць ім інтэр'ер старых дамоў, — сказаў Сцяпан Чабай з Новага Беразова, які вядзе там агратурыстычную дзейнасць і наладзіў музейчык у дзвюх памяшканнях старэйшага дома і побач яго (паказвае там між іншым вельмі даўняе абсталяванне пакоя і кухні). — Я свае хаты звонку і ўсярэдзіне абсталяваў на даўні лад, хаця і карыстаўся сучаснымі будаўнічымі матэрыяламі, без якіх цяжка было б прыстасаваць знішчаныя будынкі да жыллёвых патрэб. Турысты хочуць начаваць у пакоях абсталяваных па-даўняму, а нават спаць на шырокай драўлянай лаве і плацяць больш за такія атракцыёны, чым заплацілі б за начлег у агратурыстычнай кватэры з усялякімі сучаснымі выгадамі.

Адначасна прыезджыя хочуць мець выгады і таму перад начлегам спадар Чабай падсцілае на лаву таўсцейшае пакрывала. Стварыў ён таксама магчымасць карыстацца душам і туалетам, схаванымі за старадаўнімі дзявярыма, ды паглядзець тэлевізар, зачынены ў шафцы.

Цікавасць да побыту мясцовых беларусаў

Прыезджыя цікавяцца жыццём мясцовых беларусаў. Уладальнікі кватэр адзначаюць, што турысты ахвотна паслухалі б беларускіх песень, а некаторыя госці просяць размаўляць у іх прысутнасці па-свойму.

— Прыезджыя цікавяцца нашым наваколлем. Я адпраўляюся з імі на экскурсіі і расказваю пра мінулае. Не саромлюся, што з'яўляюся праваслаўным беларусам і гавару з сямейнікамі па-свойму. Некаторыя турысты, захопленыя нашай мовай, пачынаюць цікавіцца нашай культурай і рэлігіяй. Мае госці хочуць паглядзець старыя цэрквы, могільнікі і іншыя гістарычныя аб'екты, — сказаў Міхал Фільяновіч, уласнік агратурыстычнай кватэры і музейчыка ў Скарышэве Нарваўскай гміны.

Сцяпан Чабай заявіў, што замежныя госці прыязджалі ў Новае Беразова прачытаўшы артыкулы пра яго музейчык і агракватэру ў вядомых у свеце турыстычных часопісах. Лічыць ён, што павінна быць яшчэ больш інфармацыі пра агратурыстычную дзейнасць на Падляшшы, прэзентаваных на розных мовах у замежжы. Усе мае суразмоўцы рэкламуюцца ў інтэрнеце і праз пасрэдніцтва турыстычных згуртаванняў, калі да такіх належаць. Аднак самай лепшай рэкламай з'яўляецца рэкамендацыя тых, што ўжо наведалі прыпушчанскія агракватэры. Калі ўладальнікі кватэр сумелі зацікавіць турыстаў нашым рэгіёнам, будуць яны пераказваць сваё захапленне іншым.

Прыпушчанскай маркай з'яўляецца таксама мясцовае харчаванне: бульбяныя дранікі, свойскі хлеб, пірагі, каўбаса, ці разнародныя аладкі, якія прапануюцца часткай уладальнікаў нашых агракватэр. Аднак Белавежская пушча ўвесь час з'яўляецца вельмі важным турыстычным атракцыёнам.

— Я распавядаю пра Белавежскую пушчу, жывёл і птушак, абводзячы турыстаў па нашай „Лясной галерэі" (збудаванай побач агратурыстычнай кватэры ў выглядзе звярынага запаведніка), а пасля пускаю ім гуказапісы. Турысты могуць паслухаць як перагукваецца паміж сабой пушчанская звярына. Прыезджыя ахвотна слухаюць спеў пушчанскіх птушак. Нават польскай моладзі прапаную паслухаць нашы беларускія песні і пасля, падчас адпачынку пры вогнішчы, стараюся заахвоціць маладых людзей да спеву. Дарослыя цікавяцца нашай культурай і хочуць, каб адазвацца да іх па-свойму і расказаць пра мінулае, — тлумачыў Барыс Казлоўскі з Ляўкова. Апрача агратурыстычнай дзейнасці разам з жонкай Людмілай сабралі яны многа экспанатаў і наладзілі ў клуні музейчык з даўнімі сельскагаспадарчымі прыладамі, хатнім абсталяваннем, ткацкімі вырабамі і многімі іншымі экспанатамі.

Героі майго артыкула паказваюць нашы традыцыі і культуру таксама маладым беларусам. Зараз жа і вясковыя дзеткі слаба ведаюць аб жыцці ў мінулым і часта толькі на ўроках беларускай мовы знаёмяцца з даўнімі прыладамі працы, якія можна яшчэ ўбачыць, між іншым, у музейчыках пры агракватэрах.

Варта ўспомніць...

Набліжаецца канец года — час падвядзення вынікаў рэалізацыі інвестыцый і выбарчых абяцанак. Чаромхаўскі самаўрад сёлета рашыў закончыць асфальтаванне вуліц на новым пасёлку і слова стрымаў. Паколькі надвор'е паспрыяла для будаўнічых работ, гміна апрача таго падсыпала жвірам калдобістыя гравійкі. У пачатку снежня было папоўнена асвятленне вуліцы 1 Мая (на адрэзку ад рынка да чыгуначнага пераезда даўжынёю каля 600 метраў). Пастаўлена шэсць бетонных стаўбоў і завешана электрычныя лямпачкі. Гэта каштавала 26 835, 85 зл. Праблему неасветленага адрэзка прад'яўлялі жыхары пасёлка і радныя на сесіях Рады гміны. Як сказала сакратар гміны Марыя Іванюк, у наступным годзе будзе пастаўлена асвятленне вуліцы Абвадовай (дагэтуль неасветленай). Варта адзначыць, што жыллёвы квартал на новым пасёлку вырас пры буйным працвітанні дзяржаўнай чыгункі ў пачатках трансфармацыі на пясчаных няўгоддзях урочышча Каганка. Па мінулым Каганкі зараз след прастыў. Адно назвы вуліц напамінаюць даўніну — як у звярынцы (Яскулча, Журавя, Голэмбя) ды лясным запаведніку (Соснова, Бжозова, Сверкова, Ялоўцова, Лешчынова, Клёнова, Вежбова, Вжосова, Каштанова і Ясмінова). Шыкарныя мураванкі з прыгожай агароджай, акуратна задбаныя сядзібы ў пасёлку напамінаюць беластоцкія Дайліды. Тут працуюць дзве добра забяспечаныя таварамі крамы: прадуктовая Янкі Ліпінскага і прамтавараў „Гаян" Янкі Габрышука. Шкада, што да гэтага цывілізацыйнага прагрэсу не падходзіць шэрая рэчаіснасць заняпадаючай чыгункі, якая калісьці была асноўнай крыніцай даходу працавітых жыхароў Чаромхі.

Уладзімір СІДАРУК

Беласток

Шукай дапамогі... калі яшчэ здаровы

Спадарыня Галена Г. з Беластока доўга хварэла і лячылі яе беластоцкія дактары. Параілі ёй узяць лекарскае пасведчанне аб хваробе і стаць перад лекарскай камісіяй па справах інваліднасці.

Аркуш паперы „Wniosek o wydanie orzeczenia o stopniu niepełnosprawności" далі ёй у Гарадскім асяродку дапамогі сям'і (ГАДС) па вул. Белай (гэта насупраць рэдакцыі „Нівы"). Па „Zaświadczenie o stanie zdrowia" (пусты бланк) адаслалі яе ў *Miejski zespół ds. Orzekania o Niepełnosprawności* па вул. Варынскага 32 „А". Гэтая ўстанова знаходзіцца недзе кіламетр ад ГАДС. Спадарыні Галене баляць ногі і столькі прайсціся яна не ў змозе.

Ужо самая назва Гарадскі асяродак дапамогі сям'і неяк забавязвае да нясення дапамогі хворым ды састарэлым. Але рэчаіснасць бывае іншая. ГАДС павінен мець у сябе камплект неабходных бланкаў, але пра гэта не паклапаціўся. Адзін фармуляр мае, другога не хапае. Такі „другі" можна скапіраваць на ксераксе. Але ж не! Такая ўжо чыноўніцкая бяздушнасць. Бо не інакш. І бяздумнасць. Вось маем прыклад тае дапамогі. Ідзі і шукай сам! Невялікая бяда, калі ты яшчэ здаровы!..

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Свойска-еўрапейскі фінал

Без вялікіх залаў, шумных галаканцэртаў ды выдуманых слоў і аграмадных планаў. Сціпла і для сябе. З пачастункам і забавай пры пляценні саломы. Так нядаўна завяршыўся беларуска-літоўскі праект „Вялікае Княства Літоўскае — супольная спадчына".

Цэлы год моладзь з Пунска сустракалася з беластоцкімі дзяцьмі, якія вывучаюць беларускую мову. Самым яркім момантам гэтага знаёмства былі чэрвеньскія прэзентацыі, прымеркаваныя да прамоцыі тоўстага і вельмі якаснага выдання „Кніга Вялікага Княства Літоўскага", падрыхтаванага пад творчым вокам прафесара Андрэя Струмілы. Здавалася, што гэта будзе завяршэнне цікавага, двухбаковага праекта, але апекуны моладзі, Аста Пячуліс ды Аліна Ваўранюк, вырашылі не спыняцца так хутка.

Дзеці здаваліся крыху стомленымі пасля інтэнсіўнай працы ды не менш актыўных канікул, але знайшлі энергію сустракацца ў чарговыя разы. Праект рэалізаваўся ў асноўным у месцы, дзе нарадзілася ідэя супрацоўніцтва між дзвюма, пражываючымі па-суседску нацыямі — у Тэрэмісках, што ў Белавежскай пушчы. Нібыта глуш, канец свету, а, як аказваецца, спакой, паветра і прырода спрыяюць узніканню шалёных, але вельмі рэальных думак.

— Зараз мы завяршаем наш супольны праект, — казала ў час апошняй афіцыйнай сустрэчы настаўніца Аліна Ваўранюк. — Не абазначае гэта, што зразу і забудзем ідэю гэтага праекта.

Удзельнікі праекта дайшлі да вываду, што цяпер кожны сваім ходам будзе працягваць раскрыванне таямніц сярэднявечнай гісторыі, якая так моцна паўплывала на лёс беларусаў і літоўцаў.

— Не ўяўляю сабе, што не будзем далей сустракацца, — дадала Аста Пячуліс з Літоўскага дома культуры ў Пунску.

Людзі да сябе прывыкаюць, таму напэўна можам разлічваць на нейкую форму працягу. Прыемна было б, каб у падобны спосаб супольную гісторыю пазнавалі не толькі беластоцкія вучні. Можа неўзабаве нехта створыць шырэйшую формулу, якая прыцягне да гэтай тэмы вучняў нашых меншых гарадоў ці вёсак, дзе навучаецца беларуская мова.

„Да еўрапейскіх традыцый супольнасці" — гэта падзагаловак вялікай „Кнігі ВКЛ". Завяршэнне маладзёжнага праекта, хаця не з гэтак званай помпай, мела свой асаблівы характар. На ім з'явіліся перад усім бацькі маладых артыстаў, якіх заахвочвалі да супольных спеваў і танцаў. На калідорах Падставовай школы № 4 у Беластоку рэхам несліся словы песень, якім супольна вучыліся маладыя літоўцы і беларусы, на беларускай, літоўскай, ідыш ці лэмкаўскай мовах. Дзеці з бацькамі вярталіся да самых лепшых традыцый супольнасці ў беларуска-літоўскай гісторыі, зараз можам сказаць, дзеля супольнай еўрапейскай будучыні.

Ілона КАРПЮК

Узнагароды „Зоркі"

Ад гадоў самай папулярнай рубрыкай у „Зорцы" з'яўляецца польска-беларуская крыжаванка. Гэтая прапанова, на першы погляд простая, патрабуе шмат увагі і пошукаў. Часам, каб знайсці патрэбнае слова, трэба гартаць слоўнікі, прасіць дапамогі ў настаўніка або ў бацькоў. Вакол новых слоў многа эмоцый, смеху. Я памятаю, з якім гумарам у адной школе ўспрынялі слоўца „жараб'ёўка" (losowanie). У іншай зноў спадабалі слоўца „мурза" і пачалі ім празываць аматараў запэцканых рук і тварыкаў.

Так ці інакш нам прыемна, калі адказы на крыжаванкі дасылаюць цэлыя класы. Мы ў сваю чаргу рыхтуем небанальныя ўзнагароды. Нядаўна конкурснікі маглі выйграць Біблію для дзяцей на беларускай мове ці „Смяшынкі" Віктара Шведа.

На кожным экземпляры паэт напісаў нашым лаўрэатам прысвячэнне-пажаданне. Калі я зірнула на прысвячэнні, мне самой захацелася быць дзіцём і выйграць падобную ўзнагароду. Кніжка з аўтографам — памятка на ўсё жыццё. Яе мы павінны шанаваць і берагчы як сямейны скарб! І ведаць — такіх узнагарод не выйграем у ніякім іншым конкурсе...

Так што, даражэнькія, дасылайце нам рашэнні крыжаванак. Мы ў сваю чаргу прыдбаем вам вартасныя ўзнагароды. Раз гэта будуць беларускія кніжкі, іншы раз кампакт-дыскі з беларускай музыкай, прадметы прыдатныя ў школе або на ўроках мастацтва.

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Польска-беларуская крыжаванка № 52

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 48:

Гурт, бок, коннік, сок, ар, гіт, коні, но, сто, знак. Такс, ток, рот, кос, ногі, гонкі, рок, на, крок.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Ілона Ялоза, Яраслаў Нічыпарук** з Новага Корніна, **Агнешка Ходак, Ася Тарасюк** з Дубін, **Клаўдзія Дарашкевіч, Магда Марчук, Дыяна Клімчук, Эвеліна Самасюк, Віялета Дработа, Ізабела Плуг** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Канюкі

Гэтым разам падляшскія шляхі завялі нас у вёску Канюкі, што ў Рыбалаўскім прыходзе. Гісторыя гэтай мясцовасці ды жыццё яе жыхароў, падобна як у выпадку Рыбалаў, непасрэдна звязаны з ракой Нарвай.

Асноўным заняткам жыхароў Канюкоў было рыбалоўства. Ужо з сярэднявечча абавязаны яны былі, як і насельніцтва недалёкіх Рыбалаў, давозіць у бельскі замак назначаную колькасць рыбы. У XVI стагоддзі мясцовыя рыбакі атрымалі 4 валокі вольнай ад падаткаў зямлі.

Вёска Канюкі згадваецца ўжо ў XVII стагоддзі. Не была яна вялікай вёскай — паводле крыніц ад 1777 года Канюкі налічвалі 30 хат.

З гісторыяй Канюкоў, як і іншых прынарваўскіх вёсак, вельмі цесна звязаны людзі, якія вялікую частку свайго жыцця праводзілі на рэчцы. Маю тут на ўвазе плытагонаў, якія ў дыялекце беларусаў Падляшша называліся арэлямі.

Арэлі займаліся сплавам дрэва з Белавежскай пушчы па рацэ. Несумненна, прафесія гэтая была вельмі цяжкая, а нават небяспечная. Усё ж такі маладыя хлопцы ці мужчыны з прынарваўскіх вёсак ішлі ў гэтак званую „арэльку".

Памяць пра арэляў, якія спыняліся на адпачынак і начлег побач Канюкоў, жывая па сённяшні дзень. Гэта ж яны прыносілі з сабой навіны са свету, незвычайныя аповеды, расказвалі цікавыя легенды. Нават сёння, калі запытаем жыхароў Канюкоў пра арэляў, у адказ пачуем цікавыя гісторыі пра іх.

Канюкі, апрача прыгожага распалажэння, славяцца яшчэ тым, што тут пражывае вядомы разьбяр-самавук Уладзімір Наумюк. Хаця не закончыў ён мастацкіх школ, яго разьба па дрэве — доказ яго вялікага таленту і сапраўднага майстэрства. Пабываючы ў Канюках варта адведаць народнага разьбяра, каб пабачыць яго чароўныя працы.

Міхась СЦЕПАНЮК

Кацярына СЯНКЕВІЧ

кветка

я лёгка ўклала дзявочую кветку ў зубы
і хутка памяняліся спосабы маіх
позіркаў

я магла б намнога больш,
паўтарылася б мінулае,
падвойны смак болю, калі б ты хацеў.

Толькі што такое каханне праходзіць
праз пятнаццаць хвілін
як голад

сон („калі буду ведаць то скажу")

„ідзеш асфальтавай дарогай дня
і раптам уваходзіш у ніву
ў сцежку ночы"

пачынае грымець ды я ўцякаю адтуль,
бачу тваю хату, падворак, усё
зразу праходзіць.

я пыталася ў цябе як людзі паміраюць
калісь калі ты была яшчэ
маёй бабуляй

З паэзіяй лепш разумею свае думкі

З Касяй СЯНКЕВІЧ з Нарвы гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК.

— Кася, каторы раз прымаеш удзел у Агульнапольскім конкурсе беларускай паэзіі і прозы?

— Другі раз. Мой дэбют адбыўся ў часы, калі я была гімназісткай.

— Зараз ты ліцэістка?

— Так, я вучуся ў мастацкім ліцэі ў Супраслі.

— Жывеш...

— У Супраслі.

— З беларускай мовай кантакту не парываеш?

— Для мяне беларуская мова такая... шчырая. Гэта справа эмоцыі. Я па-свойму размаўляю ў хаце.

— Якія ў цябе былі пачаткі?

— Пісаць заахвоціла мяне спадарыня Эва Алімоўская. Яна вучыла мяне польскай мове.

— Знакамітая паэтка. Аднак, у адрозненні ад сваёй настаўніцы, ты пішаш па-беларуску.

— Гэта не зусім так. Пішу таксама па-польску. У мяне многа вершаў. Нядаўна ў мяне было натхненне, за тры дні я напісала пятнаццаць вершаў.

— Твае бацькі вядуць аграмадарыстычны пансіянат ва ўрочышчы Граматнэ, або як кажуць пад Нарвай,у Сянкевічах. Гэта прыгожая мясціна ў даліне Нарвы. Мне чамусьці твае вершы бачацца якраз у гэтым месцы?

— Тое месца для мяне як рай. У Граматным магу маляваць краявід з натуры. Там усё дасканалае. Гэтае месца мае для мяне эмацыянальнае значэнне. Я ў дзяцінстве жыла там з бабуляй Любай. Яна мяне найлепш разумела. Думаю, што ў нас падобная ўражлівасць.

— Твой бацька з Сянкевіча-Граматнага?

— Мае бацькі, маці і бацька, абое з Граматнага. Пансіянат стаіць на падмурку дзедавай хаты. Бабуля жыла пару метраў далей.

— Які вобраз спалучаеш з бабуляй?

— Часта думаю пра тое як яна была хворая, як ляжала ў шпіталі.

— Твой верш пра грымоты напісаўся ў Граматным?

— Спачатку я бегла сцяжынай, пасля трапіла ў дом бабулі, хоць мне хацелася ўцячы адтуль. Гэта быў сон.

— Хочаш стаць паэтэсай?

— Я пішу не таму, што хачу, толькі таму, што мушу пісаць. Проста, з паэзіяй лепш разумею свае думкі.

Ганна КАНДРАЦЮК

Музыка з кайфам

Калядны спеў

У гэты раз сустракаемся ў час каталіцкіх Каляд. Не адзін з нашых суседзяў святкуе якраз цяпер, а сярод іх не толькі каталікі, але і праваслаўныя. Тыя другія святкуюць або з выгады, або таму, што належаць да мяшанай сям'і. Часам нават кажуць, што гэта вельмі добрая сітуацыя ў святочны час, бо дае магчымасць адведаць сям'ю з абодвух бакоў. Не трэба спяшацца, усюды паспяваецца, а дзеці цешацца падвоенай колькасцю падарункаў. Ні праваслаўных, ні каталіцкіх Каляд не ўяўляем сабе без... калядак. Хацелася б даведацца, якія калядкі вы любіце і спяваеце. **Буду рада, калі пры нагодзе напішаце пра свае ўлюбёныя святочныя песенькі і дашлеце свае лісты з расповедамі на мэйл i_basovka@o2.pl або на адрас нашай рэдакцыі. Чакаем з нецярплівасцю! Мы і... падарункі!**

Сёння ўжо не так лёгка сустрэць сапраўдных калядніка ў кажухах і з гвяздай. Час ад часу хтосьці застукае ў дзверы, але гэта не куча з дваццаці асоб, у ліку якіх былі кавалеры з моцнымі, мужчынскімі галасамі. Так менавіта ўспамінаю калядаванне ў бабулі ў час майго дзяцінства, калі сама яшчэ не калядавала, а апрача „Рождество Христово" не ведала іншай калядкі. Пазней развучыла „Неба і зямлю" і гэта ўжо быў поспех! Шмат калядак навучылася, спяваючы ў царкоўным хоры, але помню, што тады вельмі мяне раздражняла, што ўсе калядкі былі на царкоўнаславянскай або ўкраінскай мовах. Беларуская здаралася адна на дзесяць, не больш. Можа таму да сёння захаваліся ў галаве словы: „Саўка ды Грышка ладзілі дуду, павесяліцца ды прагнаць нуду". Хаця гэта дударская песня, мы ў калядны час спявалі яе пасвойму: „Саўка ды Грышка ладзілі дуду, павесяліцца з ёй на Каляду". Няхай і дудары маюць свае калядкі! Помню таксама „Ціхую ноч". Хаця ведала, што можна яе пачуць на іншых мовах, чым польская, то калісьці не думала, што ёсць і беларускамоўны варыянт гэтага твора. Мала хто ведае, што яна напісана Францам Ксаверам Груберам у 1818 годзе ў аўстрыйскім Обэрндорфе. Музыку на словы адной з найбольш вядомых, прынамі ў Еўропе, стварыў Йосеф Мор. Такая гісторыя „Ціхай ночы", а я чакаю вашых святочна-калядных расказаў.

i_basovka@o2.pl

Галерэя Зоркі

1. Імя і прозвішча: Кацярына Сянкевіч.
2. Твой любімы прадмет: рысунак і мастацтва, ткацтва.
3. У жыцці хачу стаць: студэнткай акадэміі мастацтваў.
4. У сяброў цаню: цярплівасць.
5. Не люблю: калі чалавек ацэньвае іншых людзей.
6. Па-беларуску размаўляю: у хаце.
7. Кніжка, якая мяне захапіла: „Злачынства і пакаранне", „Сіла страху".
8. Падабаецца мне музыка: найбольш музыка гурту „The Rasmus".
9. Люблю размаўляць: з людзьмі, якія раней чым нешта скажуць, падумаюць.
10. У „Зорцы" падабаецца мне: крыжаванка.
11. Чаму: Таму, што многія дзеткі яе рашаюць, а пасля высылаюць у „Ніву", а гэта вельмі добра.

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Пад Саколкай

Як назваць прыпынак, што знаходзіцца паміж дзвюма вёскамі, напрыклад, паміж Яноўшчынай і Падкаменкай, каб не пакрыўдзіць жыхароў абедзвюх мясцовасцей, каб воўк быў сыты і каза цэлая? Трэба знайсці кампраміс, мо ўзяць для такога найменавання частку назвы адной з вёсак і скласці з часткай назвы другой?.. І так вось аўтобусны прыпынак паміж дзвюма згаданымі вёскамі, што па абодвух баках шашы з Беластока ў Саколку, нехта назваў Пад'яноўшчынай; магчыма, што гэта мясцовая назва акурат нейкага тамашняга ўрочышча...

Праходжу побач Падкаменкі па асфальтоўцы, якая пралягае там па загуменні вёскі, значыць, у вёску не заглядаю — гляджу на яе быццам не спераду, а ззаду. А што ж відаць ззаду нашых традыцыйных вёсак? Стадолы відаць, таксама крыху традыцыйныя, з бетоннымі апорнымі слупамі. У некаторых стадолах тыя слупы памаляваны на бела. Магчыма, што ў гэта маляванне быў закладзены нейкі практычны сэнс, як, напрыклад, у бяленне садовых дрэў, каб на белым фоне выяўляць шкодных насякомых ці іх лічынкі. Але і цалкам магчыма, што тое маляванне мела паправіць вясковую эстэтыку, хай сабе і з загуменнага боку.

За Падкаменкай палі памаленьку саступаюць лесу. Дзе-нідзе вырастаюць ужо самасейныя хвайнякі. Бо ж не толькі рыба шукае, дзе глыбей, але і чалавек шукае выгаднейшага месца, выгаднейшага жыцця. А тое ж выгаднейшае жыццё спакон нашых дзесяцігоддзяў вабіць у гарады, пакідаючы сялянскае жыццё найбольш заўзятым мужыкам.

Далей, на прыдарожнай бярозе прыбіты металічны крыж, спаяны з двух кавалкаў трубы. Пад крыжаноснай бярозай нізенькі драўляны платок, а ўсярэдзіне гэтай агароджы пастарэлыя пластмасавыя кветкі. Мабыць, у месцы тым нехта закончыў сваё дасюлешняе грэшнае цялеснае бытаванне; і можа яно і завяршылася, а можа рэінкарнавалася ў іншы быт... Заніканне памяці пра ягоны апошні пагэтабаковы эпізод паказвае, што і тая памяць недзе шукае магчымай рэінкарнацыі...

Зараз за гэтай бярозай ад асфальтоўкі адыходзіць жвіроўка, а зялёны дарожны паказальнік інфармуе, што тая жвіровачка вядзе да мясцовасці Міцькава Гаць. Не на ўсіх тапаграфічных картах ёсць пазначана гэтая мясцовасць, хаця павінна. Вёсачка гэтая размясцілася па абодвух берагах рэчкі Сакалды; магчыма, што ў мінулым намінальная гаць яднала абедзве часці, у якіх пасяліліся былі нашчадкі мясцовага першапраходцы. Цяпер, так мне здаецца, гацей, значыць дарожных насцілаў з галля і хмызняку па балоцістай мясцовасці, у нас не пракладаюць. Цяпер у абедзве Міцькавы Гаці пракладзены жвіроўкі ад недалёкай асфальтавай шашы. Ды і Міцькамі ў наваколлі Міцькавай Гаці напэўна цяпер не хрысцяць. Але калісь хрысцілі тут такім і падобнымі імёнамі, так як на Навагрудчыне ахрысцілі калісь нейкага продка славутага Адама Міцкевіча...

У вадзе, пад мостам цераз Сакалду, ляжыць вырваны з нейкай дарожнай абочыны асцерагальны знак. Але ж не сіла магутнай стыхіі яго туды прынесла, яго прынесла туды сіла маладой разбуральнай энергіі. Можа гэта рэха захаванага яшчэ дзенідзе гагатушнага абычаю, каб начвэрыць нейкіх начных фокусаў.

Новая Разадранка, якая расселася некалькімі адгалінаваннямі вуліцы вакол чыгуначнага прыпынку, здаецца і быць больш чыгуначнай чым сялянскай вёскай. Ну, а недалёкі лес таксама вызначае сваю ролю ў жыцці мясцовага насельніцтва — тут з боку Міцькавай Гаці тартак. А апошні панадворак з захаду вёскі абгароджаны незвычайным плотам, які выкананы з жалезных колаў ад коннай сеялкі.

Вёска Ялоўка, што за Новай Разадранкай, здаецца быць накрытая шапкай-нявідкай. Невялікая гэта вёсачка, крыху за дзесяць хат у ёй. У пачатку будуецца новы дом, мураваны, але не надта вялікі — можна нават сказаць, што кубатура ў яго традыцыйная, такая, як і ў драўляных хатах. Бо і будуецца ён, як сказаў мне адзін вясковец, ужо каля пятнаццаці гадоў. Значыць, у гаспадара няма столькіх грошыкаў, каб узводзіць сабе нейкі палац, хапае іх адно толькі каб штогадова нештанька больш падбудаваць — і так тая будова зацягваецца. Ну, а на недалёкім паказальніку назвы мясцовасці поўнасцю гаспадарыць іржа, якая і накрывае назву вёскі згаданай ужо шапкай-нявідкай.

Усё ж такі Ялоўка, у якой сельскае гаспадаранне разышлося па тых жа рэйках, што і ў большасці вёсак нашай Усходняй сцяны, захапіла мяне сваімі ганкамі. Магчыма, што я раней не надта прыглядаўся гэтым практычным аздобам нашых сялянскіх хат, але ў Ялоўцы яны мне проста нахабна залезлі ў вочы сваім дызайнерскім размахам — розныя яны і кожны на свой лад цікавы.

Старая Разадранка раздзіраецца між старым і новым. Мясцовасць гэтая была і астаецца грамадскім цэнтрам для навакольных вёсак. Тут працуюць дзве крамы, пункт прыёму малака, вясковы клуб. Тут стаяць новыя дамы, тут гібеюць старыя хаты. І вось толькі тых некалькі старых хат, якіх цяпер не абагравае ніводная чалавечая душа, захавалі на сабе сляды цяслярскага мастацтва: навугольнікі, ажурныя падстрэшнікі ці надаконнікі (аканіцы, магчыма, паадвальваліся ўжо самі), у іншых хатах іх руплівыя жыхары пазбыліся той колішняй вяскоўшчыны, абсталёўваючы іх на сучасны лад.

Касцёл у Старой Разадранцы вернікі будавалі з 1931 да 1939 года, хаця парафія была заснавана ўжо ў 1922 годзе. На недалёкім пляцы працуе таксама школа. Дах і абліцоўка гэтых двух аб'ектаў вельмі падобныя. Мяркую, што тое вонкавае афармленне, яшчэ ў жывых колерах, адбывалася ў нейкага роду сімбіёзе. І што цяпер, пасля славутага рашэння еўрасуда пра рэлігійную сімволіку ў публічных установах, у тым ліку і ў школах, якое выклікала бурную дыскусію ў нашай краіне, у Старой Разадранцы ніякіх разыходжанняў на гэты конт няма.

Вёска Гало выклікала ў мяне прыгнятальнае ўражанне. Цікава мне, ці тыя асобы, якія калісь далі гэтай мясцовасці назву, падумалі, што яна будзе сябе апраўдваць і ў наш час, у XXI стагоддзі. Бо там цяпер сапраўды „гало". Толькі ў пачатку вёскі, з боку Смалянкі, ёсць перспектыўны гаспадар. Пасля вялікі шмат вёскі займаюць развалины драўляных хат, і толькі на канцы, з боку Лябедзіна, тры, бадай, заселеныя мураванкі, ды і яны выглядаюць там даволі штучна. Акурат пры мне паказалася жыхарка адной з тых мураванак, якая сказала мне, што калісь, сорак гадоў раней, калі яна прыйшла замужжам у Гало, было тут моладзі хата ў хату. Але маладыя раз'ехаліся па гарадах, а старыя па могілках... Сядзібы зарастаюць кустоўем, ды і брук хіба неўзабаве пачне здавацца прыродзе. Бо гасцінец тут пайшоў не цераз вясковую вуліцу, толькі нажвіравалі для яго загуменную дарожку. За вёскай тартак, які прапануе хаты з дыляў.

Каля Старынкі, лябедзінскага прысёлка, сустракаю групку мужчын, якія расплянтоўваюць жвір на дарозе ад шашы да сваіх хат. Даведваюся, што рэгулярнай вёскі, з вуліцай, у Лябедзіне няма. Калісь быў у Лябедзіне маёнтак, але яго былі распарцэлявалі; будынак двара акаляюць цяпер высокія ліпы. Сапраўды, Лябедзін гэта вёска з хутароў, раскіданых па ўчастках поля з былога маёнтка. Тыя ўчасткі яшчэ абрабляюцца, нават вяршыні ўзгоркаў узрыхлены. Сам будынак былога двара, драўляны, узведзены ў 1895 годзе, здаецца быць неабжытым, але калі падыходжу бліжэй да яго, з панадворка адзываюцца сабакі. Маёнтак у Лябедзіне быў, бадай, апошнім пасяленчым паўднёвым уклініннем у рэшткі колішняй Навадворскай пушчы ў канцы XVIII стагоддзя.

Ад Лябедзіна, куды ні глянуць, далёка да буйнейшых дарог, па 6-7 кіламетраў. Кіруюся пушчай у бок Богушаў, у бок Саколкі. Лясная жвіроўка пралягае побач Шындзельскага запаведніка старога лесу. Растуць там елкі, дубы, грабы. Растуць і падаюць, так як не надта даўно павалілася ўпоперак дарогі магутная, простая як струна елка, якой камель не даў ужо рады ўтрымаць буйнага ствала. Так як старая зямелька не можа ўжо ўтрымаць пры сабе набраўшага гарадскога адукацыйнага разгону нашага маладога пакалення...

Касцёл у Старой Разадранцы

Лёс крыжыкам і вершам пісаны

Ніна БРУЧКО

Асенні халодны дзень. Дождж ліе як з вядра. Пруся аўтобусам далёка ў Беласток, аж на Лясную Даліну. Нарэшце, знайшла блок! Званю. Дзверы адчыняе добра вядомая жанчына. Абедзве шчыра ўсміхаемся, сардэчна вітаемся. Так-так, гэта ж тая самая Оля Фёдарава, па мужу Іванюк. У тую хвіліну з пакоя выходзіць Олін муж, Коля. Паціскаем сабе рукі.

— Адразу пазнала, відаць, усё ж мы крышачку змяніліся за тыя пару дзесяткаў гадоў, — весела пачынаю размову на прывітанне.

— Ну, заходзь, заходзь, мілая каляжаначка, на маю кухню, — запрашае гаспадыня.

— Кухня? Гэта ж сучасны па інтэр'еры салон з кухоннай нішай! — разглянуўшыся вакол заўважыла я ўголас. На кожнай сцяне — цудоўныя габелены, выкананыя спрытнымі залатымі рукамі Олі, апраўленыя ў драўляныя рамкі.

— Калі я занесла габелен „Белавежская пушча" абсадзіць яго ў рамкі, рамеснік даваў мне тры тысячы злотых, а я і за дваццаць яго не прадам! Люблю на іх узірацца, любавацца імі. Гляджу на панараму і адразу становіцца весялей на душы. Ды пра гэта потым, даражэнькая, зараз сядай за стол, пагутарым, мы ж не сустракаліся многа, многа гадоў... А так, пры кілішачку маёй самаробнай вішнёвачкі ўспомім мінулае і сённяшняе абталкуем...

— Так-так, Оленька, мы ж пазнаёміліся паўстагоддзя таму, шмат часу, — прызадумалася я.

— Было гэта ў 1956 годзе. У Беластоку стала дзейнічаць Беларускае грамадска-культурнае таварыства. Туды трапіла і я, увайшла ў праўленне. Пачала выходзіць „Ніва", арганізоўваліся беларускія мастацкія гурткі: тэатральны, танцавальны, хор, які вяла Людміла Панько. А мы былі тады маладымі непаседамі, усё нас цікавіла. Многа нас было, харыстаў. Памятаю нашых салістак: Веру Ляўчук, Зосю Бусловіч — добрыя галасы мелі. Тут, у хоры, сустрэла я сваё каханне, майго Коленьку, — з іскаркамі ў вачах цягнула ўспаміны Оля.

— А тэатральны гурток вёў пан Кавальчук, — уключыўся ў размову Коля Іванюк. — З першай п'есай „Пярэстая красуля" ездзілі мы ў Гарадок, Гайнаўку. Марылі аб сарганізаванні беларускага тэатра... Гарнулася наша моладзь да свайго, ой, як гарнулася — і рабочыя, і інжынеры, і настаўнікі, і чыноўнікі... Давай, Оля, нашай госці заспяваем прывітальную пенсіянерскую песеньку...

Усе мы стукнуліся кілішачкамі і гаспадары гукнулі песню пра „цікавае" жыццё *эмэрыта*.

— А цяпер я табе заспяваю маю любімую, на сваёй роднай мове, — сказала Оля. — Навучыла мяне яе мама, якая ўчула яе ад цёці Соні Ляўчук, маці Веры Ляўчук-Валкавыцкай. Жылі мы бедна, мама хадзіла ў заробкі, памагала цётцы Соні ў полі. Працавалі яны і спявалі, у абедзвюх іх былі прыгожыя галасы. Мы жылі ў Вялікім Лесе, дзе я і нарадзілася ў 1929 годзе (цяперака ён за мяжой, 25 кіламетраў ад Белавежы).

І Оля зацягнула тоненькім галаском:

За што, братэ, друга судіш,
есть над намі Буог судя.
Вуон по праўді нас розсудіт
у час Страшного суда...

Кірую зрок на габелен „Белавежская пушча", што вісіць насупраць стала. Па-майстэрску вышыты крыжыкам ваўнянымі рознакаляровымі ніткамі. Цудоўны пейзаж, адзіны такі свайго роду, непаўторны.

— Вышыла я ў ім частку свайго жыцця, перанесла на канву сваю вялікую любоў да прыроды, — кажа Оля. — Глядзі, тут смалакурня, а тут домікі і зямлянка, а далей рэчачка, у ваду якой я ўляцела быўшы малой дзяўчынкай. А побач цецярук і алень. І цар-дуб стаіць, яшчэ жывы, і веснавыя кветкі сінеюць, і цягнік-цюхця едзе. Чатыры гады я яго вышывала, як і іншыя. Толькі той вялікі, „Пантаміму", што вісіць у спальні, і сягае ад падлогі да столі, — вышывала аж дваццаць гадоў!

— Адкуль чэрпаеш тэмы — робіш рысункі, эскізы?

— Куды там! Амаль усё з галавы, а „Руіны Вавілона над ракой Еўфрат" мне прысніліся. Ніякіх рысункаў, эскізаў я не раблю, увесь рысунак нараджаецца ў маёй галаве. Бяру канву, дзялю на роўныя чатыры часткі і пачынаю калупацца крыжыкамі ад сярэдзіны ў кожным квадраце — постаці людзей, птушкі, дрэвы, кветкі, неба...

— Так вось? А дзе вучылася гэтаму рамяству? — здзівілася я.

— Нідзе не вучылася, я проста так з сэрца... Габелены пачала рабіць ужо пасля сваіх пяцідзесяці. На сваё хобі не было раней у мяне часу. І вучыцца не мела я магчымасці. Перад вайной закончыла тры класы пачатковай школы, потым два класы пры саветах, а пасля вайны трэба было памагаць маме зарабляць грошыкі на сям'ю. Бацька загінуў у час вайны, нас было тры сястры, а брацік нарадзіўся два тыдні да смерці таты. Я была найстарэйшай і мне было не да навукі. Знайшлася ў Белавежы добрая жанчына, навучыла мяне шытву, вучыла мяне за працу — за сцірку ці работу ў агародзе. Потым, калі я выехала ў Беласток, а быў гэта 1947 год, працавала я пяць гадоў у швальні „Bratnia Pomoc" у баптыстаў. Жыла ў людзей. Вечарова кончыла пачатковую школу і марыла аб далейшай адукацыі. Ды былі гэта пакуль што мары. Толькі потым правучылася год у агульнаадукацыйным ліцэі і тры гады ў будаўлянцы — усюды вечарова.

— Ты не толькі вышываеш габелены, але і пішаш вершы.

— Да ведаў і паэзіі цягнула мяне ад малога. Не ўмела я яшчэ пісаць, а вершыкі ўжо складала. Так склалася жыццё: трэба было памагаць маме гадаваць сясцёр і брата. У 1952 годзе знайшла я працу ў прадпрыемстве санітарных інсталяцый. Была сантэхнікам — адзінай жанчынай пасярод мужчын. Жаночымі рукамі і лапатай капала равы, клала трубы, муравала, не раз і на вышыні. Не было яшчэ экскаватараў, а матэрыялы вазілі фурманкамі. Не наракала я на цяжкую працу, выконвала яе сур'ёзна. А што была жанчынай у чыста мужчынскай прафесіі, не атрымлівала нічога авансам, можа толькі ўсмешкі. Таму ў 1957 годзе памяняла я занятак. Стала на працу ў энергетычным прадпрыемстве. І тут я трапіла, як кажуць, у сваё. Працавала тут аж да пенсіі. 28 гадоў мігам праляцелі. Тут мяне ацанілі належным чынам. Даслужылася я да звання майстра. Працавала і вучылася. У 1974 г. здабыла дыплом майстра-манцёра водна-каналізацыйных і газавых інсталяцый. Адна жанчына сярод мужчын! Была я майстрам пры стройцы Фаст, інтэрнатаў Палітэхнікі, піваварні ў Дайлідах і іншых пабудоў! — з гонарам у голасе пералічыла Оля. — Будучы ўжо пенсіянеркай я яшчэ працавала. У мяне ўсяго аж 56 гадоў працы! Запамятаўся мне такі адзін „Сільвестар", калі я дзяжурыла на Новы год усю ноч, пільнавала абагравальных вузлоў, а раненька 1 студзеня ішла дадому. Я з работы, а іншыя з баляў і я чужых, незнаёмых віншавала з Новым годам.

— А вершы? Мабыць, не было ў цябе часу на твае захапленні — дом, муж, дачка Галіна...

— Не, не! Менавіта тады пачала я многа пісаць. Інспірацыяй для творчасці было маё задавальненне ад новай працы. Мяне тут цанілі. Вершы пісала я на розныя нагоды — вечарыны, святы. Былі і гумарыстычныя, і крытычныя. Умела я развесяліць супрацоўнікаў прадпрыемства дэкламацыяй вершаў, спевам і гэтым усім іх прыцягнуць да вясёлай забавы.

Оля раскрывае перада мною тоўстую папку з вершамі, якія пісала, як кажа, ад заўсёды. Не толькі пры нейкіх нагодах, але шмат пра сваё жыццё, дзяцінства, прыроду, пра свае развагі, мары. Кожны габелен мае сваю гісторыю, свой верш: *Рознакаляровыя гранітныя скалы, вада сваім бляскам берагі малюе. Галінка лістоўніцы туліцца да боку, сваімі калючкамі скалу пацалуе* — гэта фрагмент верша пра габелен „Судан". Або, пра „Белавежскую пушчу": *Елкі ўзнеслі свае шаты як сцены касцёлаў над квітнеючым імхом паляны. Прыгожая пушча ў Перавалоцы, як акіян намаляваны.*

Оля піша на польскай і беларускай мовах, таксама і на „белавежскім" дыялекце.

Піша для сабе, для блізкіх і знаёмых. На сустрэчах уласнікаў агародных участкаў дэкламавала вершы не раз, запісвалі іх у хроніцы. Гэта вершы аб прыродзе, супольнай працы, пенсіянерскіх сустрэчах. Не выстаўляла таксама сваіх габеленаў, паказвае іх толькі сябрам і знаёмым. Асяродак анімацыі культуры прасіў пазычыць іх на выстаўку ў святліцы, ды... пашкадавала.

У 2010 годзе Оля і Коля Іванюкі адсвяткуюць пяцідзесяцігоддзе свайго сужонства. Оля напісала ўжо на гэтую нагоду верш. Хоць ужо немаладая, стараецца не наракаць на здароўе ды думае пра будучыню. Ходзіць цяпер на курсы і майстар-класы, арганізаваныя Падляшскай палатай інжынераў санітарных інсталяцый. І тут паказвае свае пасведчанні, вылучэнні, сертыфікаты.

— У інжынерскім бюлетэні напісалі вялікі артыкул пра мяне, — цешыцца і гулліва ўсміхаецца. — Цікаўлюся новымі тэхналогіямі, матэрыяламі. Можа яшчэ фірму сваю засную? Цяпер больш займаюся раслінасцю, зёлкамі. Збіраю травы, вырошчваю зёлкі ў агародчыку. Калісьці абыходзіла ўсе лясы вакол Беластока, Гайнаўкі, ды цяпер нават на аўтобусах з гэтым цяжка... Люблю смакаваць свае здаровыя гарбаткі... Ведаю, для чаго якая траўка можа прыдацца...

Пасядзела я з Оляй і Колем доўга, папіваючы настойку і гарбатку, слухаючы песень, вершаў, гісторый пра кожны габелен. Забыліся мы пра хваробы, клопаты, дзесяткі гадоў...

У яго катоў было чалавек 50

Фота Міры ЛУКШЫ

Сяргей Стэльмашонак

— На вашым партрэце маю ахвоту дамаляваць вушкі! — находзіць на мяне проста дзіцячая гарэзнасць на выставе ў Культурным цэнтры Беларусі ў Беластоку (вул. Модлінская, 2) 14 снежня 2009 г., на адкрыцці выставы графічных постэраў Сяргея Стэльмашонка *CATalogue*. Выстава мела працягвацца да 29 снежня, ды заходзьце ў КЦБ яшчэ да 15 студзеня 2010 года, пацешыцца ката-марганай цудоўных колераў і ідэй. А вушкі ўжо дамаляваны гэтаму цікаваму чалавеку і мастаку — графіку, дызайнеру, пісьменніку і галоўнаму рэдактару мінскай каляровай вельмішматтыражкі „Тахі". Працы гэтага мінчаніна, народжанага ў Санкт-Пецярбургу (у 1956 годзе), характэрны „арыгінальнасцю падыходу і незвычайным пачуццём гумару" — пішуць пра яго не толкі каталюбы і цешацца імі ва ўсім свеце. — „Ілюстрацыі Стэльмашонка ў часопісах вылучаюцца мяккай іроніяй, а прыдуманыя ім подпісы надоўга застаюцца ў памяці чытачоў". Выдумляе Сяргей Стэльмашонак знакі, лагатыпы, назвы тарговых марак, буклеты, розную дызайн-графіку, піша таксама розныя тэксты. Выстаўляецца з 1979 года. У часопіснай ілюстрацыі з 1981 года (тысячы малюнкаў). Напісаў і выпусціў тры кнігі дзіцячых казак са сваімі малюнкамі.

Прыезд і выстава якраз у гэтыя дні ў Беластоку для Сяргея Стэльмашонка знамянальныя.

— 38 гадоў таму я ўпершыню апынуўся ў Польшчы ў гарцэрскім летніку, — успамінае аўтар. — Першая паездка за мяжу з-за „жалезнай заслоны", першыя сустрэчы з замежнымі аднагодкамі ды першае знаёмства з рок-музыкай: лонгплеі „Чырвоных гітар", „Брэкаўта" і Чэслава Немэна, музыкальныя паштоўкі з „Бітлзамі" і „Блексабат". Першы фірменны дыск, які трымаў у руках — „Pearl" Джэйніс Джоплін. Музыка літаральна перавярнула свядомасць, трапіла ў крывацёк і засталася там назаўсёды. Праз некалькі гадоў, у час навучання ў Мінскай акадэміі мастацтваў, я ўпершыню пабачыў кнігі пра польскі плакат, якія выклікалі неверагодную прагу да творчасці. Павага і любоў да польскага плаката мае месца ў маёй душы і дагэтуль. З падзякай за адкрыццё свету культуры праз амаль 40 гадоў пасля першага наведвання я зноў вяртаюся ў Польшчу з цалкам новым цыклам графічных постэраў — *CATalogue*, каб упершыню прадэманстраваць іх менавіта тут. У гэтым своеасаблівым каталогу арганічна злучыліся сталы запал да рок-н-рола, плакатная графічная манера і нязменнае захапленне выявамі катоў і котак, якіх я малюю больш за дваццаць гадоў. Апроч рок-катоў, на выставе *CATalogue* прадстаўлены некаторыя з маіх самых любімых графічных малюнкаў на тэму катоў і котак, а створаных за чатыры апошнія пяцігодкі. Паколькі наступны год, год Тыгра, які належыць да сямейства кацінных, цалкам лагічна выглядае мая цікавасць да дэманстрацыі маіх катоў менавіта напярэдадні надыходзячага 2010 года.

Музычныя захапленні Сяргея Стэльмашонка відавочныя: з якой любоўю і гумарам прадставіў у кашэчых вобліках — Чэслава Немэна, „Бітлзаў", Эльвіса Прэслі, Джэйніс Джоплін, Джымі Хендрыкса, Тома Уэйтса, Франка Запу, Яна Андэрсана, Боба Дыляна, Эліса Купера, Эмі Уайнхаус і Крысціну Агілеру!

— Мы ўсе пакрысе каты! — заявіў ён. — Гэта мой мастацкі выбар і прыём. А за ўсё маё свядомае жыццё ведаў катоў чалавек 50. Можа забыўся іх імёны, але памятаю іх у твар.

Міра ЛУКША

Каты — як людзі

Мы пакрысе катамі
з камп'ютарнаю мышкай.
Сяргей Стэльмашонак

Мы бачым на выставе
шмат постацяў кашэчых,
якіх мастак цікава
зусім ачалавечыў.
Ды нават коцік п'яны,
з недапітай чаркай,
не страшыць нас заганай —
алкагольнай, яркай.
Мы хітрасць і каханне
бачым у вачанятах.
Катам шлем прывітанне
за наш настрой прыўзняты!
Выстава цешыць будзе
і павучаць таксама.
Часам каты — як людзі,
мы — пакрысе катамі.

Беласток, 14.12.2009
Віктар ШВЕД

Моладзі заўсёды ўласцівы бунтарскі дух. Дзіўнага ці адмоўнага ў гэтым мала чаго — канфлікт бацькоў і дзяцей з'яўляецца адным з чыннікаў развіцця чалавечага грамадства. Таму без перабольшання можна сказаць, што бунтарства і моладзь неад'емныя адзін ад другога.

Не абышоў бунтарскі дух і Байнэта. У ім нават існуе сайт з назвай „Бунт", дэвіз якога „Хопіць чакаць — дзейнічай".

„Шапка" галоўнай старонкі, якая месціцца па адрасе **www.buntby.com**, выкананая з большага ў чорна-чырвоных „анархісцкіх" танах, што як мага лепш падыходзіць для бунтарства. Што ж тычыцца ідэйнага напаўнення сайта, то яно мае нацыянальна-адраджэнскі і дэмакратычны накірунак.

Сайт падзелены на тры традыцыйныя часткі. З левага боку — выйсці на шматлікія яго старонкі, пасярэдзіне — асноўная інфармацыя, з правага боку — банэры блізкіх па духу інтэрнэт-рэсурсаў.

Першы блок рубрык ідзе пад назвай „Навіны". Тут, на старонцы „Акцыі" змяшчаецца інфармацыя пра акцыі, праведзеныя дэмакратычнымі сіламі Беларусі з нагоды тых ці іншых святкаванняў ці падзей.

„Аналітыка" падае розныя артыкулы, карысныя, з пункту гледжання аўтараў „Бунту", для азнаямлення. Спектр тэм — разнастайны: ад артыкула пра „аматара дыктатараў" італьянскага прэм'ера Берлусконі да расповеду аб тым, што беларуская моладзь найменш за іншых беларусаў мае патрэбу ў беларускай мове.

Нейкім працягам „Аналітыкі" бачыцца рубрыка „Гісторыя", дзе месцяцца артыкулы на гістарычныя тэмы.

„Супраціў у свеце" — арганічная частка „Бунту". Наўрад ці дадзены партал мог бы абысціся без расповедаў аб тым, як звяргалі дыктатараў ці праходзілі рэвалюцыі.

Чамусьці асобнай рубрыкай падаецца „Грузія". Магчыма з-за таго, што мінулагодняя вайна ў гэтай краіне і дагэтуль не пакідае абыякавымі стваральнікаў сайта. Адносіны паміж дзвюма варагуючымі дагэтуль бакамі — Грузіяй і Расіяй — паранейшаму прыцягваюць увагу беларускіх „бунтароў".

А ўжо пра тое, хто гэта менавіта такія беларускія прыхільнікі бунту распавядаецца ў наступным блоку рубрык, у прыватнасці на старонцы „Маніфест". „Мы, маладыя грамадзяне Беларусі, якія любяць сваю Радзіму, якія ўпэўнены ў тым, што беларускі народ варты лепшага жыцця, якія вераць, што сітуацыю ў краіне можна выправіць у лепшы бок, заяўляем аб тым, што мы больш не будзем мірыцца з свавольствам злачыннай улады і аб'яўляем аб пачатку агульнанацыянальнай кампаніі актыўнага супраціву, якая прывядзе да замены дыктатарскага рэжыму Лукашэнкі на дэмакратычна абраны законны беларускі ўрад", — вось так ваяўніча акрэсліваюць бунтары сябе і свае мэты.

Разам з тым ідэйныя натхняльнікі сайта не заклікаюць біць шкла ў магазінах ці перакульваць аўтамабіляў. Іх спосаб — негвалтоўны супраціў. Тады, праўда, не зразумелым становіцца, што маецца на ўвазе пад словам „бунт". Бо негвалтоўны супраціў — гэта звычайная прынцыповая нязгода ў дачыненні да чагосьці несправядлівага, і слова „бунт", што абазначае актыўнае, часам непрадуманае, дзеянне, тут не зусім пасуе.

Адной з найбольш каштоўных рубрык сайта падаецца рубрыка „Рэпрэсіі", дзе змяшчаецца пералік прозвішчаў тых маладых людзей, што спазналі пераслед ад лукашэнкаўскай улады за свае дэмакратычныя погляды і актыўныя дзеянні па іх адстойванні.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

У мінулым нумары былі вызначаны лепшыя беларускія атлеты адыходнага года. У гэтым выпуску аддаём даніну жанчынам і падсумоўваем увесь 2009 год. Коратка прадставім лепшую дзесятку беларускіх спартовак мінулага года, без лішняй лірыкі, падаўшы толькі галоўныя дасягненні.

1. Кацярына Карстан (акадэмічнае веславанне) — чарговы раз чэмпіёнка свету, плюс пераможца адноўленага чэмпіянату Еўропы.

2. Аляксандра Герасіменя (плаванне) — другое і трэцяе месцы на першынстве кантынента на „кароткай вадзе", чэмпіёнка ўніверсіяды, шэраг нацыянальных рэкордаў.

3. Вікторыя Азаранка (вялікі тэніс) — сёмы нумар сусветнага рэйтынгу, пераможца некалькіх турніраў з серыі СТА ў адзіночным і парным разрадах.

4. Настасся Новікава (цяжкая атлетыка) — чэмпіёнка Еўропы і віцэ-чэмпіёнка свету ў катэгорыі да 58 кг.

5. Меліта Станюта (мастацкая гімнастыка) — чацвёртае месца на чэмпіянаце свету ў шматбор'і, россып медалёў рознай вартасці на этапах Гран-пры.

6. Вікторыя Чайка (кулявая стральба) — трэцяе месца ў агульным заліку Кубка свету ў практыкаванні з малакаліберанага пісталета.

7. Вікторыя Паўловіч (настольны тэніс) — трэцяя ў адзіночным разрадзе на чэмпіянаце кантынента, там жа стала сярэбранай прызёркай у міксце. Таксама другія месцы на адкрытых чэмпіянатах Славеніі і Нямеччыны.

8. Алена Філіпава (вольная барацьба) — трэцяе месца на чэмпіянаце свету і другое на першынстве Еўропы.

9. Марына Тумас (валейбол) — у складзе турэцкага „Фенербахчэ" трэцяе месца ў Кубку ЕКВ.

10. Святлана Цімашэнка (дзюдо) — бронзавая прызёрка кантынентальнага першынства.

У спісе намінаваных знаходзіліся таксама Надзея Астапчук і Надзея Міхневіч (абедзве — штурханне ядра), Настасся Верамеенка і Алена Леўчанка (абедзве — баскетбол), Святлана Хахлова (плаванне), Дар'я Домрачава (біятлон), Вольга Панарына (велатрэк), Любоў Чаркашына (мастацкая гімнастыка).

Са зборных значнага поспеху дасягнула беларускае жаночае трыо ў першынстве старога свету па стральбе з пісталета. Жана Шапялевіч, Вікторыя Чайка і Кацярына Кручанок сталі чэмпіёнкамі Еўропы. 4-е месца на чэмпіянаце свету ў эстафеце заняў біятлонны квартэт. Эстафетная каманда (4 па 400 метраў) па лёгкай атлетыцы заваявала бронзавыя ўзнагароды кантынентальнага першынства ў залах. Зборная краіны па стральбе з лука на чэмпіянаце свету заняла вышэйшае ў гісторыі 4-е месца. Але камандамі года назавем баскетбольную жаночую дружыну, якая заняла 4-е месца на еўрапейскім першынстве і заваявала пуцёўку на чэмпіянат свету, а таксама мастацка-гімнастычную звычайную, якая ўзяла серабро на першынстве свету і каманду ў групавых практыкаваннях — два другія і адно трэцяе месцы.

У цэлым жа год для беларускага спорту не быў адзначаны нейкімі надзвычайнымі заваёвамі. Выключэнне хіба толькі — выступ айчынных весляроў на чэмпіянаце свету, дзе быў здзейснены сапраўдны фурор. Ды яшчэ дасягненні беларускіх акрабатаў на чэмпіянаце Еўропы. Варта пахваліць айчынных веласіпедыстаў і тэнісістак, якія ўсё настойлівей стукаюцца ў сусветную эліту. Нагадвалі поспехамі пра сябе самбісты, дзюдаісты, баксёры і тай-баксёры на прафесійным рынгу. Расчаравалі ж лёгкаатлеты, фехтавальнікі, прадстаўнікі бальшыні гульнёвых відаў. З клубаў хіба толькі футбольны барысаўскі БАТЭ зноў дадаў сабе аўтарытэту. Для прадстаўнікоў зімовых дысцыплін момант ісціны надыдзе ў надыходным алімпійскім сезоне.

Будзем чакаць новых мірных баталій на спартовых арэнах, стадыёнах і пляцоўках. З Новым годам і Калядамі!

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

УСЛЕД ГОДУ БЫКА

— Гэтая дамова нам патрэбная, паколькі мы з'яўляемся натуральнымі партнёрамі, — сказаў беластоцкі прэзідэнт Тадэвуш Трускаляскі ў час урачыстасці падпісання трохгадовай дамовы аб супрацоўніцтве паміж Беластокам і Гроднам.

Адкрыванне брамы

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Цяпер мы павінны гэтую дамову напоўніць зместам, — дадаў мэр Гродна Барыс Казялкоў.

Урачыстасць у прысутнасці м.інш. генеральных консулаў — польскага ў Гродне і беларускага ў Беластоку ды старшыні Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў Пятра Валадзько адбылася ў прыўзнятай атмасферы ў імпазантным Гасцінным палацыку ў Беластоку, над дзвярыма якога луналі сцягі абедзвюх дзяржаў. Пасля падпісання дамовы прэзідэнт Трускаляскі сказаў:

— Сёння наступіла доўгачаканая ўсімі намі хвіліна, калі мы падпісалі доўгачаканую дамову, якая, з падобным зместам, была ўжо падпісана ў 2003 годзе і абавязвала тры гады ды скончыўся яе тэрмін. За тры апошнія гады такой дамовы ў нас не было. А зараз, калі паглядзім на карту і глянем на дзяржаўную мяжу Польшчы з Беларуссю, пабачым, што Беласток і Гродна з'яўляюцца найбліжэй распаложанымі гарадамі. Раздзяляе нас толькі 70 кіламетраў і ў Гродна з Беластока бліжэй чым у Варшаву, Люблін ці Ольштын, а нават параўнальная гэта адлегласць як у Ломжу, а бліжэй нам чым у Сувалкі. Так вось Гродна гэта наш натуральны партнёр па прычыне адлегласці, суседства і магчымасці супрацоўніцтва ў розных галінах.

Прэзідэнт Беластока адзначыў:

— Гэтая дамова дае магчымасць супрацоўніцтва ў галіне гаспадаркі, асветы, культуры, спорту. Запісаны ў ёй таксама магчымасці рэалізацыі супольных праектаў, напрыклад, пры выкарыстанні сродкаў з Еўрапейскай тэрытарыяльнай стратэгіі ці праграмы „Усходняе партнёрства". Цяпер толькі ад нас залежыць як гэтую дамову зрэалізуем. Напэўна будучыня пакажа, што гэтая дамова нам патрэбная, перш за ўсё жыхарам нашых гарадоў.

У сваю чаргу мэр Казялкоў адзначыў:

— Ёсць у нас шмат гарадоў-пабрацімаў, з якімі супрацоўнічаем, не толькі падобных да нас па прычыне велічыні. Дзякуючы гэтай дамове з'явіўся шэраг магчымасцей паміж Гроднам і Беластокам. Гэта эканоміка, асвета, культура, спорт. Усё цяпер залежыць ад людзей ва ўладах нашых гарадоў. Мусім старацца, каб наступны этап гэтага супрацоўніцтва быў больш эфектыўны.

Генеральны консул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык:

— Мы доўга ішлі да падпісання гэтай дамовы. Супрацоўніцтва, якое ўжо было, спадзяюся, будзе яшчэ лепшым. Гродна адкрытае для ўсіх польскіх грамадзян, таксама і для журналістаў.

Генеральны консул РП у Гродне Адам Бернатовіч:

— Адкрыццё гэтага супрацоўніцтва мае большае значэнне чым толькі для абодвух гарадоў. Для польскіх консульскіх службаў, а думаю што і для беларускіх таксама, гэты факт мае вялікае значэнне, бо лепш працуецца, калі ёсць такая дамова. Хацелася б забыцца пра мяжу, бо ў шмат якіх выпадках яна дакучлівая, паколькі няма яшчэ візавых палёгкаў у асабовым руху паміж Польшчай і шырэй Еўрасаюзам ды Беларуссю. А калі наступяць такія крокі як сённяшні, будзем бліжэй да таго, каб тая ненатуральная мяжа была як найменш дакучлівай.

У час прэс-канферэнцыі мы спыталіся ў граданачальнікаў як тая дамова будзе ўпісвацца ў праграму „Усходняга партнёрства", на рэалізацыю якой Еўрасаюз прызначыў ужо першыя грошы. Тадэвуш Трускаляскі адказаў:

— Як у кожным партнёрстве, залежыць яно ад двух бакоў. Наша задача — максімальная нівеліроўка вынікаў існавання мяжы. Рэшта Польшчы ўспрымае нас у адмоўным сэнсе — як усходнюю сцяну, на якой штосьці канчаецца. Хочам, каб нас асацыявалі як браму на Усход. У рамках „Усходняга партнёрства" хочам рэалізаваць шмат праектаў. Першы будзе датычыць абучэнняў беларускіх партнёраў, звязаных з рэалізацыяй еўрасаюзных праектаў. Сам я таму вучыўся ў партнёраў з Ірландыі. Дыяпазон праектаў будзе залежаць ад таго, хто будзе іх пісаць.

Барыс Казялкоў:

— Маем ужо нейкія вынікі супрацоўніцтва ў рамках „Усходняга партнёрства". Нашымі партнёрамі з'яўляюцца тры літоўскія гарады, а ў Польшчы — Сувалкі і Аўгустаў. Да сакавіка, калі будуць абмяркоўвацца рашэнні аб прызначэнні адпаведных грантаў, паспеем яшчэ апрацаваць праекты, напрыклад, з галіны эканомікі, турызму ці медыцыны. Найважнейшае — пачаць.

Пры нагодзе спыталіся мы ў абодвух консулаў, калі ўрэшце дойдзе да падпісання дамовы аб малым памежным руху паміж Польшчай і Беларуссю (раней прадугледжвалася падпісаць яе ў канцы лістапада 2009 года). Консул Бернатовіч:

— Рызыкоўна гаварыць аб прадказаннях наконт якіхсьці падзей, але з ранейшых нашых пагадненняў з панам консулам Аляксейчыкам вынікае, што нашы інфармацыі згодныя. Да падпісання дамовы можа дайсці недзе ў палове студзеня 2010 г. Паколькі гэта вялікае лагістычнае, інфарматычнае мерапрыемства ды вялікі выклік для кансультантаў па прычыне нейкіх фармальных недагаворак і арганізацыйных прычынах, пасля наступіць яшчэ пару месяцаў, пакуль дамова ўступіць у сілу. Думаю, што пачне яна абавязваць на пераломе вясны і лета 2010 года.

У дзень, у якім была падпісана дамова аб супрацоўніцтве паміж Беластокам і Гроднам, ва Універсітэце ў Беластоку аб праграме трансгранічнага супрацоўніцтва размаўлялі прадстаўнікі ўлад гэтай вучэльні ды ўніверсітэтаў — імя Янкі Купалы ў Гродне і імя Аляксандра Пушкіна ў Брэсце. Дэталяў гэтага супрацоўніцтва не ведаем, вядома, аднак, што згодна з прапановамі гродзенскага боку мае яно тычыцца эканомікі, гісторыі і права, а брэсцкая вучэльня хацела б рэалізаваць супольныя праекты з факультэтам беларускай філалогіі Універсітэта ў Беластоку.

Спачуванні

Сардэчныя словы шчырага спачування **Віктару Шведу** ў горы — смерці **брата Пятра Шведа** з Мора — выказвае

калектыў „Нівы"

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афганскую прыказку.

1. араматычная расліна сямейства ароідных (*Acorus calamus*) = 37 _ 38 _ 36 _;

2. парнакапытная жывёліна з галінастымі рагамі = 10_ 17 _ 18 _ 8 _ 16 _;

3. абрэвіятура дарожнай міліцыі ў Беларусі = 20 _ 21 _ 4 _;

4. самка гуся = 6 _ 28 _ 27 _ 25 _;

5. спадарожнік Юпітэра, адкрыты Галілеем у 1610 годзе = 32 __ 2 __;

6. неглыбокае месца ў рацэ = 33 _ 31 _ 3 _ 9 _;

7. галоўная рака паўночнай Італіі = 13 _ 12 _;

8. старажытнагрэчаская стыхія, якая існавала да ўзнікнення свету = 29 _ 5 _ 7 _ 19 _;

9. адкрытая галерэя ў верхняй частцы царкоўнага будынка для размяшчэння хору = 11 _ 30 _ 22 _ 23 _;

10. Яўген, беларускі кампазітар (1893-1970) = 15 _ 14 _ 35 _ 34 _ 24 _ 1 _ 26 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 47 нумара

Сорам, гляк, Гартны, вакансія, кіно, певень, харыст, цівун, конь.

Рашэнне: **Маляваныя кветкі не пахнуць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Міхалу Байко** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 14 000 egz.

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (6)

Ганна КАНДРАЦЮК

Фота Міры ЛУКШЫ

Люда Бельская на печцы Анатоля Сыса

Калі шэсць гадоў таму мы з сяброўкамі ўпершыню дабіраліся ў прыдняпроўскую вёску Анатоля Сыса, на дагледжаных беларускіх дарогах праследавалі нас наравістыя коні. У цэнтры Століна, ля помніка з русалкай, конь сам выпрагся з воза і ашалелы ўскочыў на прыступкі сталовай. Цуд, што тады абышлося без крыві. Нібыта дапамагла малітва, якую ў пару змовілі дзяўчаты, стоячы на фатальных прыступках. Год пазней з-за кабылы з жарабём мы папалі ў дарожную катастрофу і цудам пазбеглі ран...

Эратычна-сексуальны код у паэзіі Анатоля Сыса часта пазначаны выявай каня і атмасферай гвалту (*А ў тваім, Люцыян, Дняпры, што жывіў спакон веку гоні, тры русалкі, славянкі тры янычаравых мыюць коней — А. С.*). У гэтым месцы хочацца напісаць як паэт: *бо Конь — гэта больш чым конь.* Матыў каня, як пасля асвецяць нас землякі Анатоля, жыўцом спісаны з купальскіх абрадаў, якія па сёння спраўляюць у Гарошкаве. Анатоль Сыс, як кожны мясцовы хлопец, не ўяўляў свята кахання без Дняпра і мясцовых *русалак*.

І, канешне, без каня, дадаў бы ў гэтым месцы паэт!

* * *

Каля хаты нумар 143, калі мы тэпалі ў дом-музей паэта, нас *штосьць* спыніла. На хатцы, што насупраць названага нумара, мы прыкмецілі антэну, зробленую з кола ад ровара. У галаве бліснулі думкі пра канспірацыю. Анатоль Сыс у адным са сваіх інтэрв'ю пра аднавяскоўцаў сказаў: *Яны такія самыя нацыяналісты як я!*

— Цікава, ці тут *Белсат* ловяць? — падумалі мы ўголас.

Нацыянальную свядомасць гарошкаўцаў мы высветлілі ўжо на пачатку знаёмства. Калі мясцовыя хлопцы пачулі, што мы з Польшчы, яны, як усе ахвяры савецкай адукацыі, давай называць нас *палячкамі*.

— Мы такія палячкі, як вы расіяне, — патлумачылі мы.

І хапіла! Пасля гэтай далікатнай праўкі нас пачалі ўспрымаць як партнёрак. Дакладней, як файных жанчынак. Такім, як мы з Мірай, многа не трэба. Мы нават малацікавы камплімент раздзьмухаем да належных нам мерак. Як небанальнае прывітанне, якім пачаставаў нас Вася Бельскі, траюрадны брат Аноля:

— А колькі ты мужыкоў мела? — спытаў на *добры дзень* Міру Лукшу.

Сваяк паэта з ходу належным чынам ацаніў жаночы патэнцыял і тэмперамент маёй сяброўкі. І, не чакаючы яе адказу, сам сабе адказаў: *Трох?!*

У мой бок Вася выказаў этнічна-купальскае захапленне: — *Во, якая русалка!*

Гэты неадназначны камплімент доўга не даваў мне спакою. У маёй падляшскай вёсцы русалкамі завуць жанчын з распушчанымі валасамі, нават калі яны стогадовыя бабусі. Іх будуць западозрываць у кантактах з таемнымі сіламі, карацей, пабачаць у іх ведзьмаў.

* * *

Анатоль Сыс, калі прыязджаў з Мінска ў Гарошкаў, мала калі дбаў пра камфорт і выгоду. Замест пад'ехаць як чалавек пад дом, ён прасіў шафёра спыніцца шэсцьсот метраў далей...

Больш-менш у тым месцы дзе і нас з Мірай спыніла!

Паэт, перш чым да сябе, заходзіў у дом нумар 143. Да сваякоў: Люды і Васіля Бельскіх. Павітаўшыся, ён адразу ляцеў у купальны пакой. Прымаў душ, брыўся, чысціў пазногці... Пасля апранаў чыстую кашулю, ваксаваў туфлі. Каб паказацца маці свежым і задбаным.

— Ён вельмі дбаў пра гігіену, — Людміла, як працаўнік санаторыі, ведае пра што гаворыць. — Модна насіўся, асабліва як яшчэ маладым быў.

Але жыццё не любіла яго прыхарошаным. Ды і сам свежапабрыты Анатоль не спяшаўся да роднае хаткі. Яшчэ добрую палову дня ён гасцяваў у Бельскіх. Яго там кармілі і паілі, апавядалі хто нарадзіўся, хто памёр у Гарошкаве...

— Не заўважыш як час з ім зляціць, — Люда з вялікай сімпатыяй успамінае свайго траюраднага швагра, — бо з ім усім было так цікава, так лёгка. Душа чалавек быў. Апошнім падзеліцца.

— Гэта вы рыхтавалі яму чыстую кашулю на змену? — спытала я ў дзелавітай сваячкі паэта.

— А дзе там! Анатоль прывозіў з сабой з Мінска адзенне на змену. І, ведаеце, пакуль дойдзе да сваёй хаты, параздае яго людзям. Хопіць, як каго сустрэне на вуліцы і той яму скажа: *Якая ў цябе класная майка*. Толік здыме з сябе тую майку і падорыць сябру. Бывала, у адных шортах да роднай хаты прыходзіў...

Фота Міры ЛУКШЫ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Васіль Бельскі - траюрадны брат Анатоля

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

(*А вось і Айчына. А каля яе рыпучых весніцаў стуленыя бацька з маці, як тыя два птахі пад кастрычніцкімі зябамі. — Матуля, нёс я на шыі нізку абаранкаў — не данёс. — Бацька, нёс я табе цераз плячо катанкі — не данёс. Колькі было веставых крыжоў на шляху, столькі сустрэў пакутнікаў. А вы ж самыя ўсё жыццё мяне вучылі: не абміні гаротніка. — А. С.*)

(працяг будзе)

2010 год

(22.03. — 20.04.) Год поўны прыгод. 7.03. — поўня кахання, 21.03. — пачынай новыя мерапрыемствы, 26.06. — праверка сіл, 4.10. — поспех у каханні і прафесіі. Пільнуйся: 4.08., 14.12.

(21.04. — 21.05.) Ты цвярозы, талковы, зрэалізуеш планы. 15.01. — паспяхова ў каханні і прыбытках, 17.02 . — мілыя прэзенты ад лёсу, 1.04. — час на працяглыя планы і дамовы, 11.04. — шанц на прафесійны поспех, 10.08. — цяжкія справы давядзеш да фіналу. Пільнуйся: 26.01., 11.03., 15.06., 1.11.

(22.05. — 22.06.) Многа запалу і сіл давесці ўсё да канца. 19.01. — новыя прапановы; 27.02. — бліскучыя ідэі, час на публічную дзейнасць, 15.06. — пацягне цябе ў свет, 8.10. — карысныя дамовы на даўжэйшы час. Пільнуйся: 8 і 16.03., 8.06., 30.07., 2.10.

(23.06. — 23.07.) Новыя людзі. Актыўнае жыццё, раз'езды. 12.02. і ў блізкія дні — атрымаеш тое, чаго чакаеш у каханні і ў інтарэсах, 17.04. — асабліва добры час на паляпшэнне фінансаў і ўзмацненне сяброўства, 5.06. — вельмі спрыяльны момант у эратычным і сямейным жыцці, 4.10. — паварот да лепшага, трывалыя добрыя змены. Пільнуйся: 2.02., 11.04., 17.07., 14.12.

(24.07. — 23.08.) Запал, энергія, аптымізм, баявітасць. Нагоды зрэалізаваць усе планы. 8.01. — ідэальны момант на пачатак важных мерапрыемстваў, 17.02. — шмат добрага ў каханні і ў інтарэсах, 27.03. — набярэш ветру, 15.06. — паспяхова, але не жадай зашмат, 9.08. — трывалыя і плённыя рашэнні. Пільнуйся: 5.04., 19.09., 25.10.

(24.08. — 23.09.) Год лягчэйшы. Менш мусіш, больш можаш. 15.01. — добры час на пачатак мілага знаёмства ці карыснага мерапрыемства, 5.04. — адно здарэнне зматывіруе цябе і прыспешыць твае справы, 15.07. — удалы зварот у каханні або цудоўны выезд, 4.10. — неспадзяваная важная сустрэча. Пільнуйся: 14.02., 14.06., 2.11.

(24.09. — 23.10.) Будзеш працавіты, дакладны, трывалы, планы далёка пойдуць у будучыню. 22.01. — добры момант пачаць працу над важнай справай, пазнаёмішся з важнай асобай, 17.02. — аптымізм і ідэальная варажба для кахання, 5.05. — творчасць і добрае выкарыстанне талентаў, 8.08. — зялёнае святло для амбітных мэт і далёкіх падарожжаў, 4.09. — зведаеш, якая будзе твая будучыня. Пільнуйся: 31.07., 4.08., 14.12.

(24.10. — 22.11.) Асабліва шчаслівы год! Усё будзе табе спрыяць. Выкарыстаеш усе нагоды. 17.02. — вельмі карысна ў каханні, 8.03. — інспірацыі, новыя ідэі, каштоўныя знаёмствы, 15.06. — паскарэнне планаў, далёкае падарожжа, 22.09. — у каханні пачатак серыі шчаслівых выпадкаў, у інтарэсах час на рэалізацыю мэт. Пільнуйся: 28.01., 11.04., 3.08.

(23.11. — 22.12.) Найважнейшая сям'я. 17.02. — закахаешся; цікавыя планы, 5.04. — добры час на пачатак абучэнняў, большых хатніх мерапрыемстваў, 15.06. — падарожжы, 5.10. — сямейнае свята. Пільнуйся: 6.02., 27.06., 30.07., 10.08.

(23.12. — 20.01.) Будуць цябе цаніць. 15.01 — важныя рашэнні, пераможаш страхі, 14.02. — час на каханне, інвенстыцыі, 24.07. — важны выезд, мілыя сустрэчы, 1.10. — шанц на любоўнае захапленне ці знаёмства, 5.12. — моцна станеш на нагах. Пільнуйся: 26.06., 4.08., 14.12.

(21.01. — 19.02.) Амбіцыя і ўпартасць. 22.01. — добры момант у каханні і рэалізацыі важных жыццёвых планаў, 6.05. — час на бізнес і ў пары, 24.08. — рэалізуй уласныя планы, кіруй лёсам як хочаш, 8.09. — шчасце ў хаце. Пільнуйся: 26.04., 5.06., 31.07., 6.11.

(20.02. — 21.03.) Ідэальны год (горш летам). Адны поспехі! Энергія, адвага. 17.02. — блізка каханне! 28.02. — цікавыя сустрэчы з людзьмі важнымі для твае кар'еры, 15.04. — папулярнасць, поспех на экзаменах, слава, 1 і 23.10. — добры час на шлюб, важныя рашэнні. Пільнуйся: 15.03., 2.05., 26.06., 10.08.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960